Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 СНЕЖНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 245 (30379)

У РЫТМЕ АДЗІНСТВА 6



# «ЦІКАВАСЦЬ ВЕЛІЗАРНАЯ Ў АМАНА ДА БЕЛАРУСІ»

## Падрабязнасці рабочага візіту Прэзідэнта



Рабочы візіт Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Султанат Аман ад самай цырымоніі сустрэчы кіраўніка нашай краіны Султанам суправаджаўся цырыманіялам візіту афіцыйнага або дзяржаўнага. Ганаровая варта, выкананне гімна, залпы артылерыйскіх гармат. Усе гэтыя і іншыя нюансы — знак асаблівай павагі боку, які прымаў. СТАР. 2

Фота БелТА.

Беларусь лічбавая

# УСЯ КРАІНА НА ЭКРАНЕ КАМП'ЮТАРА

## Інфраструктура электронных камунікацый пашырае магчымасці карыстальнікаў



**На працягу жыцця кожны з нас неаднойчы звяртаўся ў тыя ці іншыя дзяржаўныя структуры, каб атрымаць даведку, выпіску або іншы дакумент. Сёння гэта можна зрабіць у рэжыме анлайн дзякуючы існаванню партала «Е-Паслуга» і аднайменнага мабільнага дадатку. Калі вы яшчэ не карыстаецеся гэтымі сэрвісамі, паспрабуйце: гэта практычна, сучасна, а галоўнае — вельмі зручна. А мы раскажам, якія новыя паслугі з'явіліся на партале напярэдадні надыходзячага 2025 года.**

Работа над пераводам дзяржаўных сэрвісаў «у лічбу» вядзецца бесперапынна. Ужо 12 гадоў рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Нацыянальны цэнтр электронных паслуг» развівае адзіны партал электронных паслуг і з году ў год папаўняе яго цікавымі электроннымі сэрвісамі, расказала **прэс-сакратар дзяржаўнага прадпрыемства «НЦЭУ» Мая ЕНДЭЛАДЗЭ**.

— Сёння на партале 638 сэрвісаў для розных спажыўцоў: як для грамадзян і арганізацый, так і для бізнесу. Усе сэрвісы, а гэта 255 электронных паслуг і 383 адміністрацыйныя працэдуры, размеркаваны па катэгорыях (усяго іх 19).

Напрыклад, у катэгорыі «ДАІ, транспарт» размешчаны 40 электронных паслуг і 9 адміністрацыйных працэдур. Карыстальнік можа атрымаць звесткі аб ДТЗ, вышуку, дагаворы страхавання, дыягнастычных аглядах аўтамабіля, залогу рухомай маёмасці, аб правах і абмежаваннях правоў на кіраванне аўтамабілем. СТАР. 7

ISSN 1990 — 763X

24245

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на І квартал і І паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на І квартал або І паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «ЦІКАВАСЦЬ ВЕЛІЗАРНАЯ Ў АМАНА ДА БЕЛАРУСІ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Дзень 15 снежня прайшоў пад знакам перагавораў Аляксандра Лукашэнкі і Султана Амана Хайсама бен Тарэка Аль Саіда. Лідары краін абмеркавалі стан і перспектывы развіцця адносін, кірункі, па якіх можна надаць дадатковы імпульс двухбаковаму супрацоўніцтву. Кіраўнікі дзяржаў таксама абмяняліся меркаваннямі па актуальным міжнародным парадку дня. Перагаворы лідары краін правялі ў пашыраным складзе з удзелам членаў дэлегацый. Затым прайшла сустрэча ў фармаце адзін на адзін. Прадоўжыліся перагаворы і вечарам, падчас афіцыйнага прыёму ад імя Султана ў гонар Прэзідэнта Беларусі.

> **Вельмі добрую прапанову ўнёс Султан — стварыць тут хаб — такі цэнтр беларускіх тавараў».**


Фота БелТА.

Усе афіцыйныя стасункі праходзілі за зачыненымі дзвярыма. Некаторыя падрабязнасці Аляксандр Лукашэнка раскрыў журналістам назаўтра, падчас наведвання Нацыянальнага музея Амана ў Маскаце. Ён паведаміў, што пасля наведвання музея яго размова з Султанам працягнецца: «Мы вызначым некалькі канкрэтных напрамкаў ужо не супрацоўніцтва, а нашых дзеянняў. І мы пачнём гэта рабіць да таго, як ён прыедзе да нас». Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, што падчас перагавораў напярэдадні яны з Султанам Амана вызначыліся стратэгічна. «А вось цяпер мы з ім сустрэнемся ў такой рабочай абстаноўцы і пагаворым аб канкрэтных праграмах і праектах. Яны ўжо напрацаваныя», — расказаў журналістам кіраўнік дзяржавы.

«Мы створым міжурадавую камісію або камітэт, выпрацуем дарожную карту, план. У наступным годзе Султан паабяцаў прыехаць у Беларусь. І да гэтага часу мы выпрацуем дарожную карту. І не толькі будзем чакаць яе зацвярджэння, але і сёе-тое зробім практычна», — сказаў Прэзідэнт. «Султан прапанаваў стратэгічныя напрамкі супрацоўніцтва. Для нас вельмі важна, каб мы вызначылі кропку. Порт, можа быць, яшчэ нешта будзем глядзець. І адтуль пайшлі нашы тэхналогіі, якія ў Амане патрэбныя. Таму мы будзем на беларускіх тэхналогіях ствараць тут сумесныя прадпрыемствы і будзем рухацца на захад, на ўсход, на поўнач адсюль, з Індыйскага акіяна, прадаючы свае тавары, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Вельмі добрую прапанову ўнёс Султан — стварыць тут хаб — такі цэнтр беларускіх тавараў. І я ўчора яму шчыра сказаў, што вырабляць мы навучыліся шмат што. Гандляваць — яшчэ не вельмі. Ну а яны спрадвеку (умеюць гандляваць. — **«Зв.»**). І ў гэтым плане паабяцалі нам аказаць дапамогу. Словам, закрытых тэм наогул не было. Цікавасць велізарная ў Амана да Беларусі. Мы, напэўна, не вельмі актыўнічалі тут».

«Гандлюючы спачатку таварамі, мы гатовыя тут ствараць сумесныя прадпрыемствы і пашыраць тут вытворчасць і разам гандляваць на гэтым шляху. Гэта датычыцца вельмі многіх прадуктаў, тавараў. Мы пра гэта публічна не гаворым з-за пэўных прычын», — заявіў Прэзідэнт.

> **Мы створым міжурадавую камісію або камітэт, выпрацуем дарожную карту, план. У наступным годзе Султан паабяцаў прыехаць у Беларусь. І да гэтага часу мы выпрацуем дарожную карту. І не толькі будзем чакаць яе зацвярджэння, але і сёе-тое зробім практычна».**

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ўжо быў з візітам у Амане 17 гадоў таму і ўжо тады пазнаёміўся з Хайсамам бен Тарэкам Аль Саідам, які цяпер з'яўляецца Султанам Амана. «Ён тады мяне сустракаў, суправаджаў. Таму мы ўжо з ім знаёмыя. І нам лёгка было весці перагаворы», — падзяліўся кіраўнік дзяржавы.

## Дарэчы

**Экскурсію для кіраўніка дзяржавы па Нацыянальным музеі Амана правёў генеральны сакратар музея Джамаль аль-Мусаві. Маці Джамаля аль-Мусаві — ураджэнка Беларусі, а сам ён выдатна гаворыць па-руску. Яго дзед — ветэран Вялікай Айчыннай вайны, чым аманскі ўнук вельмі ганарыцца. Са сваякамі ў Беларусі яго сям'я падтрымлівае цёплыя адносіны. Што датычыцца Нацыянальнага музея, ён падпарадкоўваецца Султану Амана і з'яўляецца стратэгічнай установай. «Мы займаемся пытаннямі нацыянальнай ідэнтычнасці. Пытаннямі, хто мы ў глабальным свеце», — распавёў кіраўнік музея. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ў Мінску прыступаюць да ўзвядзення новага будынка Нацыянальнага музея гісторыі, а таму важна паглядзець, як падобныя музеі ўладкаваны ў іншых краінах свету, вывучыць вопыт».**



**Не абышлося падчас візіту і без абмену падарункамі. Кіраўнік беларускай дзяржавы падарыў Султану Слуцкі пояс і пісталет-кулямёт сістэмы Шпагіна — легендарную зброю Вялікай Айчыннай вайны. У сваю чаргу Султан падарыў беларускаму лідару традыцыйны аманскі кінжал Ханджар. Гэты выгнуты кінжал — абавязковы прадмет традыцыйнага касцюма арабаў Амана, нацыянальны сімвал краіны. Аляксандр Лукашэнка ўзамен уручыў Султану манету, што традыцыйна прынята, калі прымаеш у падарунак халодную зброю. «У Палацы Незалежнасці будзе ў нас — у рэзідэнцыі Прэзідэнта», — адзначыў ён.**



Фота БелТА.

# Настрой — на доўгатэрміновыя адносіны

«Насамрэч адчуваецца гатоўнасць нашых аманскіх калег да выбудоўвання менавіта доўгатэрміновых адносін, — заявіў журналістам міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў. — У аснове гэтых адносін мы ўжо бачым павагу адзін аднаго, сапраўды непадробную цікавасць. Мы разглядаем Аман як дзяржаву, якая на працягу сваёй тысячагадовай гісторыі мела заўсёды ключавыя пазіцыі ў гандлі і развіцці адносін па ўсім рэгіёне. Гэта і ўся Усходняя Афрыка, адносіны з найбліжэйшым Еменам, Індыяй. Таму сёння мы вельмі разлічваем на падтрымку Амана не толькі ў развіцці простых гандлёва-эканамічных адносін паміж дзвюма краінамі, але і па выкарыстанні магчымасцяў Амана для прасоўвання нашай прадукцыі далей на іншых рынках. І перадумовы гэтаму ёсць. Менавіта ў падобным ключы гаварылі лідары нашых краін».

«Нішто так добра не рухае адносіны, як чалавечыя кантакты, — адзначыў Максім Рыжанкоў. — Тыя дамоўленасці, якія былі дасягнуты і сёння замацаваны канчаткова тут: першае — будзе магчымасць для нашых турыстаў, якія плануюць наведаць Аман, да 14 дзён прыехаць сюды без візы. У аэрапорце проста будзе бясплатнаставіцца штамп». Паводле яго слоў, таксама ёсць планы па адкрыцці прамога рэйса з Беларусі ў Аман. «Практычна засталіся толькі тэхнічныя моманты, усе ўзгадненні ўжо прайшлі», — удакладніў Максім Рыжанкоў. Ён упэўнены, што гэта вельмі сур'ёзна паўплывае на турыстычныя адносіны паміж дзвюма дзяржавамі. З аднаго боку, у Амане ёсць на што паглядзець з пункту гледжання прыроднай прыгажосці і гістарычнай спадчыны, мясцовых традыцый. З іншага боку, прамы рэйс і магчымасць знаходжання без візы дазволяць людзям убачыць патэнцыяльныя магчымасці для бізнесу. «Прамы рэйс — гэта заўсёды магчымасць і нейкія тавары давезці, калі яны патрэбны. Уласна кажучы, усё гэта стварае аснову, абапіраючыся на якую мы можам ісці далей», — заявіў міністр. Адказваючы на ўдакладняльнае пытанне, калі ж менавіта можа быць адкрыты прамы рэйс, Максім Рыжанкоў сказаў: «Засталіся нейкія тэхнічныя рэчы, якія дазваляюць казаць пра тое, што пры іх рэалізацыі ў самы бліжэйшы час, ужо, напэўна, з лютага, мы можам пра гэта ў практычнай плоскасці казаць».

У ВЯДУЧЫХ СМІ СУЛТАНАТА ВЫЙШАЎ АРТЫКУЛ АЛЯКСАНДРА ЛУКАШЭНКІ ПРА ПЕРСПЕКТЫВЫ СУПРАЦОЎНІЦТВА ДЗВЮХ КРАІН. ПРЫВОДЗІМ ТЭКСТ ПУБЛІКАЦЫІ ЦАЛКАМ, ЯНА, НЕСУМНЕННА, БУДЗЕ ЦІКАВАЯ І НАШЫМ ЧЫТАЧАМ



# БЕЛАРУСЬ І АМАН: ТРАДЫЦЫІ ДРУЖБЫ Ў ЗМЕНЛІВЫМ СВЕЦЕ


Follow us on facebook/omanobserver, X @omanobserver

OMAN DAILY Observer 9

MONDAY · DECEMBER 16 · 2024

OPINION

## Belarus and Oman: Friendly traditions in a changing world

ALEKSANDR LUKASHENKO

*The writer is the President of the Republic of Belarus*

THE friendly relations between Belarus and the Sultanate of Oman have been around for more than 30 years during which we have been steadily fostering our relationship and exploring new opportunities for developing bilateral relations. I visited your beautiful country for the first time in 2007, and the more I got to know Oman, the more I became convinced of the closeness of the mentalities of the two peoples despite thousands of kilometres separating us.

After overcoming many historical challenges, Minsk and Muscat focused on two priorities to ensure further stability:

First, and foremost building a state that is concerned with the social aspects in which caring for the human being turns from a mere slogan into a political track. Belarus had announced early that Belarus is a state of the people.

In this aspect, Belarus is similar to the Sultanate of Oman, where the ambitious national plan Oman Vision 2040 lays the foundations for social welfare which indicates the deep strategic thinking of the Omani leadership that clearly cares for future generations.

The second priority is building conflict-free relations with all countries near and far regardless of their size, political weight and influence in international affairs. Belarus and the Sultanate of Oman, each in its region, are known for their efforts to ease tensions and undertake initiatives for peaceful negotiations.

Life proves every day that investing in peace and security is the most important and wisest investment at the present time, it's an investment that allows planning and allows an opportunity for development in all fields.

I am aware that the Sultanate of Oman has opted for a strategic approach in boosting the non-oil sector's contribution to the national economy. This approach reflects the wise vision of the Omani leadership and judging by my experience I can say that the main resource of any country is its people. It is through hard work that Belarus was able to overcome the enormous political and economic pressures that our country is experiencing and achieve success. The people are the backbone of any state and the real wealth of any nation lies in its intellectual potential.

I am confident that the deepening of Belarusian-Omani relations could become a new growth axis for the two economies and an incentive for the development of human capital. This has become evident by the current level of political contacts and the foundations we have set up. However, there is also a huge unrealised potential. Trade and economic relations are the solid foundation on which strong bilateral cooperation can be established.

*Besides, Belarus can share its experience with the Sultanate of Oman in the field of modern technologies from electric buses and software solutions for smart cities to drones, nanomaterials and satellites.*

Belarus can supply the Sultanate of Oman with products such as mechanical engineering, chemical industry, food and light industry. Belarus possesses a world-class petrochemical industry.

The high quality of Belarusian medicine and advanced medical treatment technologies have become another trademark of the country. Our infant mortality rate is one of the lowest in the world, and organ transplantation in Belarus is very advanced. Patients come to Belarus from all over the world seeking medical treatment. Therefore, we are ready to provide our Omani friends with the opportunity to be treated by highly professional doctors and cooperate in training medical personnel and exchange experience.

Besides, Belarus can share its experience with the Sultanate of Oman in the field of modern technologies from electric buses and software solutions for smart cities to drones, nanomaterials and satellites.

Belarusian exporters are ready to participate in the development of new markets within the framework of the Omani National Programme for attracting foreign investment.

Our governments are currently working to create the most comfortable travel conditions possible, and there are plans to open a direct air link between the two countries in the near future.

**Арабская прымаўка гаворыць: «Дружба — дар Усявышняга, і мы павінны берагчы яе».**

Дружбе Беларусі і Амана ўжо больш чым 30 гадоў. І ўсе гэтыя гады мы паслядоўна ішлі па шляху яе ўмацавання, шукалі новыя магчымасці для развіцця адносін. Акуратна, па-ўсходняму ўзважана і прадумана, імкнучыся не нашкодзіць.

Першы раз я наведаў вашу выдатную гістарычную краіну з яе дзівоснай прыродай і выдатнымі, ветлівымі людзьмі ў 2007 годзе. І чым больш я знаёміўся з Аманам, тым лепш разумеў, наколькі мы блізкія па менталітэце. А нас жа раздзяляюць тысячы кіламетраў.

**Але няма нічога дзіўнага, што нашы погляды на жыццё і светапогляд вельмі падобныя. Час не шкадаваў нашых продкаў, якія апынуліся воляю лёсаў на шляхах рассялення людзей у Еўразіі і Афрыцы, скрыжаваннях гандлёвых шляхоў і скрыжаванні цывілізацый.**
**Напэўна, у тым ліку таму ў нас няма глыбінных рознагалоссяў, мы маем падобныя меркаванні па многіх актуальных пытаннях сусветнага парадку дня.**

Сучасны свет не стаў прасцейшы. Яго раздзіраюць супярэчнасці. Сёння ніхто не ў стане гарантаваць нам бяспеку і дабрабыт. Цяперашняму пакаленню гэтаксама, як і пару стагоддзяў таму, даводзіцца вырашаць вельмі складаныя агульначалавечыя задачы.

Мінск і Маскат узялі курс на забеспячэнне непахіснасці двух базавых прыярытэтаў.

Па-першае, і гэта галоўнае, пабудова сацыяльна арыентаванай дзяржавы, дзе рэальны клопат пра людзей не проста лозунг, а палітычны курс. Калісьці мы абвясцілі, што Беларусь — дзяржава для народа.

І ў гэтым Беларусь і Аман таксама падобныя. Уражвае сваім маштабам і амбіцыйнасцю задач дзяржаўная праграма Oman Vision 2040, яна закладвае асновы сацыяльнага дабрабыту, што сведчыць аб глыбокім стратэгічным мысленні кіраўніцтва Султаната Аман і клопаце аб будучых пакаленнях. І нам гэта вельмі імпануе.

Другі прыярытэт — бесканфліктнае выбудоўванне адносін з усімі блізкімі і далёкімі нам краінамі незалежна ад іх памеру, палітычнай вагі і ўплыву ў міжнародных справах. Беларусь і Аман, кожны ў сваім рэгіёне, добра вядомыя намаганнямі па дээскалацыі напружанасці, ініцыятывамі мірных перагавораў. Жыццё штодня даказвае, што інвестыцыі ў мір і бяспеку — сёння самыя запатрабаваныя і мудрыя рашэнні, якія дазваляюць планаваць развіццё па многіх кірунках.

**Беларусы ў прынцыпе па сваёй прыродзе — выключна гасцінныя і мірныя людзі. Мы заўсёды рады добрым сябрам і хочам жыць у міры з усімі. Наш нацыянальны гімн пачынаецца са слоў «Мы, беларусы, — мірныя людзі...» і гэта не гульня слоў. Гэта квінтэсенцыя нашага гістарычнага шляху.**

**Што такое Беларусь? Якая яна? Напэўна, будзе правільным для пачатку коратка апісаць маю краіну.**

Рэспубліка Беларусь займае вельмі важнае з пункту гледжання геапалітыкі месца, з'яўляючыся геаграфічным цэнтрам Еўропы. Наша тэрыторыя гістарычна з'яўляецца мостам паміж Усходам і Захадам, Поўначчу і Поўднем Еўразійскага кантынента.

Гэта акалічнасць, з аднаго боку, заўсёды вызначала ключавую ролю Беларусі ў рэгіянальнай палітыцы, а з другога — з'яўлялася крыніцай шматлікіх бед для беларускага народа. Наша зямля на працягу стагоддзяў была ў эпіцэнтры войнаў і ваенных канфліктаў.

У выніку Другой сусветнай вайны, якая ў нашу гісторыю ўвайшла як Вялікая Айчынная вайна 1941—1945 гадоў, мы страцілі трэць свайго насельніцтва. Эканоміка Беларусі была практычна цалкам знішчана, гарады ляжалі ў руінах, тысячы вёсак былі спалены, многія — разам з іх жыхарамі.

За велізарныя ахвяры вайны наша рэспубліка была ўдастоена гонару стаць адной з краін — заснавальніц ААН.

Дзякуючы Савецкаму Саюзу, у склад якога ўваходзіла Беларусь, мы здолелі не толькі хутка аднавіць свой даваенны ўзровень развіцця, але і здзейсніць уражальны экспанентны ўзлёт.

Наступная бяда напаткала нас у 1986 годзе, калі на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі адбылася аварыя, якая стала тэхнагеннай катастрофай стагоддзя. Нягледзячы на тое, што АЭС не належала нашай рэспубліцы і знаходзіцца на суседняй, украінскай тэрыторыі, найбольшы ўрон нанесены менавіта беларускаму народу. Дастаткова сказаць, што яго сума перавысіла 25 бюджэтаў нашай краіны за 1986 год.

І якраз на гэты перыяд прыйшоўся глыбокі эканамічны крызіс, выкліканы распадам СССР, які пацягнуў за сабой разрыў жыццёва важных кааперацыйных сувязяў, перакрыў пастаўкі недарагіх сыравінных рэсурсаў і рынкі збыту гатовай прадукцыі.

Ва ўмовах такіх эканамічных і палітычных выклікаў Рэспубліка Беларусь у 1990 годзе набыла незалежнасць. Галоўная задача тады была — у літаральным сэнсе адвесці краіну ад бездані.

Мы не проста зрабілі гэта. Мы цалкам перабудавалі эканамічную сістэму, захавалі ключавыя прадпрыемствы і навукова-канструктарскія школы, забяспечылі адзінства ўлады і кіравальнасць.

Сёння Рэспубліка Беларусь — дзяржава з канкурэнтаздольнай экспартна арыентаванай эканомікай, прадукцыя якой вядомая ва ўсім свеце. Мы сваімі сіламі цалкам забяспечваем харчовую бяспеку краіны і пастаўляем на экспарт сельскагаспадарчую прадукцыю на агульную суму каля 8 мільярдаў долараў ЗША. Не маючы выхаду да мора, Беларусь здолела стварыць уласны рыбалоўны флот і рыбаперапрацоўчую галіну, пабудаваную на самых сучасных тэхналогіях. 30 працэнтаў сусветнага рынку кар'ерных самазвалаў займаюць нашы магутныя самазвалы БЕЛАЗ. А БЕЛАЗ-75710 грузапад'ёмнасцю 450 тон увайшоў у Кнігу рэкордаў Гінеса.

Беларусь, як і Аман, уваходзіць у пул краін, якія рэалізоўваюць касмічныя праграмы. Мы займаемся развіццём атамнай энергетыкі і асваеннем Антарктыкі.

І гэта пры тым, што ў Беларусі адсутнічаюць уласныя радовішчы сыравіны (перш за ўсё вуглевадароднай).

Ведаю, Аман абраў стратэгічны шлях паступовага пераходу да ўмацавання ролі ненафтавага сектара ў нацыянальнай эканоміцы, што адлюстроўвае мудрае бачанне кіраўніцтва Амана.

**На сваім вопыце магу сказаць, што галоўны рэсурс заўсёды — людзі.**

Гэта іх працай Беларусі ўдаецца пераадольваць той неймаверны палітычны і эканамічны ціск, які аказваецца на нашу краіну. І дамагацца поспехаў.

Народ — апора дзяржавы. Нашы золата і нафта — у інтэлектуальным патэнцыяле нацыі.

Перакананы: далейшае паглыбленне беларуска-аманскіх адносін можа стаць новым пунктам росту для абедзвюх эканомік і стымулам для развіцця чалавечага капіталу. Пра гэта сведчыць цяперашні ўзровень палітычных кантактаў і створаны намі зачын. Але ёсць і каласальны нерэалізаваны патэнцыял.

Гандлёва-эканамічныя адносіны з'яўляюцца тым моцным падмуркам, на якім можна ўзвесці будынак двухбаковага супрацоўніцтва любой вышыні.

**Што Беларусь можа прапанаваць Аману?**

Перш за ўсё гэта адносіцца да паставак беларускай прадукцыі машынабудавання, хімічнай галіны, прадуктаў харчавання, лёгкай прамысловасці.

Мы маем перадавыя па сусветных мерках прадпрыемствы нафтахіміі.

Біятэхналогіі і фармацэўтыка — у ліку нашых прыярытэтных вектараў развіцця. Прывяду толькі адзін факт: больш за палову лекаў у краіне — айчыннай вытворчасці. І гэтая доля расце. Беларусь прапануе шэраг унікальных прэпаратаў для лячэння анкалагічных, імунных і сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Высокая якасць беларускай медыцыны і перадавыя тэхналогіі лячэння сталі яшчэ адной візітнай карткай краіны. Узровень дзіцячай смяротнасці ў нас адзін з самых нізкіх у свеце. Сучасная беларуская транспланталогія — перадавая галіна, да нас з'язджаюцца пацыенты з усіх куткоў Зямлі, нават у самых безнадзейных выпадках. Мы гатовыя даць нашым аманскім сябрам магчымасць лячэння ў высокапрафесійных урачоў, супрацоўніцтва ў сферы падрыхтоўкі медыцынскіх кадраў і абмен найлепшымі практыкамі.

Беларусь можа прапанаваць шырокі спектр напрацовак у кластары новых тэхналогій — ад электробусаў і праграмных рашэнняў для разумных гарадоў да беспілотнікаў, нанаматэрыялаў і спадарожнікаў.

Беларускія экспарцёры гатовыя да сумеснага асваення новых рынкаў у рамках Нацыянальнай праграмы Амана па прыцягненні замежных інвестыцый.

**Дзякуючы свайму размяшчэнню Мінск таксама імкнецца ўмацоўваць інвестыцыйнае супрацоўніцтва шляхам прыцягнення прамых замежных інвестыцый высокай якасці для рэалізацыі амбіцыйнай задачы — стаць міжнародным гандлёва-лагістычным і вытворчым хабам. А гэта выдатная магчымасць для Аманскіх кампаній, якія шукаюць сферы для інвеставання ў несыравіннай галіне. Такое партнёрства будзе спрыяць развіццю вытворчай базы ў розных сектарах эканомікі і павелічэнню ўкладу экспарту ў ВУП нашых краін.**

У папярэднія гады Беларусь і Аман эфектыўна супрацоўнічалі ў справе вывучэння арабскай мовы. Прыйшоў час пашырыць нашы магчымасці, у тым ліку за кошт падрыхтоўкі на базе беларускіх навучальных устаноў кіраўнічых і рабочых кадраў для эканомікі Амана па інжынерна-тэхнічных, медыцынскіх і іншых спецыяльнасцях.

У цяперашні час нашы ўрады працуюць над стварэннем максімальна камфортных умоў для паездак. У найбліжэйшых планах — адкрыццё прамога авіямаршруту паміж дзвюма краінамі. Запрашаем у Беларусь бізнесменаў, студэнтаў, турыстаў. Нам ёсць што паказаць!

Вы гэтаксама, як і ўсе нашы партнёры, ацэніце абавязковасць беларусаў. Мы захоўваем вернасць нашым дагаворам нават у самых складаных умовах.

Я перакананы, што пазітыўная дынаміка беларуска-аманскіх адносін ужо ў найбліжэйшы час дасць выдатны плён, якім у поўнай меры змогуць скарыстацца нашы людзі і які прымножыць дабрабыт будучых пакаленняў.

Фота БелТА.

На кантролі

# «ЧАСАМ ДАСТАТКОВА ЧАЛАВЕКА ПРОСТА ВЫСЛУХАЦЬ»

## Аб чым Наталля КАЧАНАВА гаварыла на выязным пашыраным пасяджэнні Прэзідыума Савета Рэспублікі

**Тэма пасяджэння, якое прайшло на базе ЗАТ «Атлант», — «Аб выніках работы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб у г. Мінску». 10 снежня члены Савета Рэспублікі правялі адзіны дзень прыёму грамадзян у сталіцы. На базе ЖЭС, якія традыцыйна з'яўляюцца месцам рэгулярнай прысутнасці насельніцтва, сенатары сустрэліся з людзьмі і выслухалі іх праблемы. Нярэдка пытанні, з якімі да парламентарыяў звяртаюцца грамадзяне, тыповыя, таму ёсць неабходнасць абмеркаваць іх такім шырокім складам.**



### «СЛУХАЦЬ І ЧУЦЬ ЛЮДЗЕЙ»

Як звярнула ўвагу Наталля Качанава, для членаў Савета Рэспублікі работа са зваротамі грамадзян, юрыдычных асоб, увогуле работа з людзьмі — адзін з прыярытэтных кірункаў дзейнасці. «Працуючы над законапраектамі, нарматыўнымі прававымі актамі, у сваёй рабоце мы найперш кіруемся тымі задачамі, якія паставіў кіраўнік дзяржавы; задачамі, якія мы выконваем у адпаведнасці з графікам работы над законапраектамі; пытаннямі і прапановамі, якія ідуць ад людзей, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Таму для нас настолькі важная гэтая работа».

Пры гэтым спікер заўважыла, што работа са зваротамі грамадзян важная не толькі для членаў Савета Рэспублікі, а ў цэлым для ўсіх органаў улады, кіраўнікоў розных узроўняў. Спікер нагадала, што кіраўніком дзяржавы неадназрова ставілася задача — слухаць і чуць людзей. Пры гэтым, як працытавала спікер Прэзідэнта, часам дастаткова чалавека проста выслухаць, не адштурхоўваць яго: толькі ў такім выпадку ў рабоце са зваротамі грамадзян будуць вынікі.

Як канстатавала Наталля Качанава, формы і метады работы з людзьмі могуць быць абсалютна рознымі. Добра зарэкамендавалі сябе выязныя прыёмы па асабістых пытаннях, калі сенатары наведваюць рэгіёны. Сёлета члены Савета Рэспублікі прымалі грамадзян у Гомельскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Віцебскай абласцях, у сталіцы. «Гэтыя прыёмы, як правіла, паказваюць: якія найбольш ключавыя і балючыя пытанні ёсць у жыхароў», — адзначыла спікер.

### «САМАЗАСПАКОЙВАЦЦА НЕЛЬГА»

Старшыня Савета Рэспублікі паведаміла, што апошні прыём грамадзян, праведзены ў сталіцы, яе парадаваў. Крыху больш за палову заяўнікаў прадстаўлялі Мінск, астатнія прыехалі на прыём з іншых рэгіёнаў.

Аднак самазаспакойвацца, па словах Наталлі Качанавай, нельга. «Усё роўна 25 % (гэта менш, чым было раней) тых зваротаў, якія паступаюць у Савет Рэспублікі, — гэта горад Мінск, — удакладніла яна. — Мы разумеем: усё-такі самая вялікая колькасць людзей, якія пражываюць у Мінску, — не параўнаць ні з адной вобласцю. Але разам з тым пераважаюць пытанні жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта тыя пытанні, якія можна і патрэбна вырашаць».

Спікер адзначыла, што ў цэлым колькасць зваротаў у Савет Рэспублікі скарацілася. Па словах Наталлі Качанавай, гэта звязана з тым, што службовыя асобы выконваюць свае функцыянальныя абавязкі і працуюць з людзьмі вельмі адказна, не адштурхоўваючы іх, унікаючы ў тыя пытанні і праблемы, якія ёсць.

Па словах спікера, звяртаюцца людзі і з пытаннямі, якія ўвогуле ляжаць на паверхні і не патрабуюць асаблівых намаганняў у іх вырашэнні. Такія пытанні, як падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі, павінны вырашацца аператыўна. Наталля Качанава даручыла ўважліва разглядаць звароты, якія паступаюць ва ўсе інстанцыі. Асаблівую ўвагу, па яе словах, трэба ўдзяляць калектыўным і паўторным зваротам. «І нельга казаць аб тым, што гэта скаржнік, які прыходзіць з разу ў раз, — удакладніла яна. — І на гэтага чалавека трэба паглядзець: у якіх умовах ён жыве, што ў яго адбываецца». У гэтай сувязі спікер лічыць неабходным шэраг зваротаў накіроўваць кіраўнікам грамадскіх арганізацый. «Гэта правільны падыход. У нас дзяржава сацыяльна-арыентаваная», — акцэнтавала ўвагу Старшыня Савета Рэспублікі.

Наталля Качанава паставіла задачу — зрабіць работу са зваротамі грамадзян яшчэ лепш. «Тое, што людзі звяртаюцца да членаў Савета Рэспублікі, дэпутатаў, іншых службовых асоб, дарагога варта, — перакanана спікер. — Гэта трэба не толькі захаваць, але і прымножыць. Мы павінны яшчэ лепш працаваць, бо для гэтага ў горадзе Мінску ёсць абсалютна ўсё».

Пасля завяршэння выязнога пасяджэння Наталля Качанава азнаёмілася з работай ЗАТ «Атлант», пагутарыла з калектывам прадпрыемства. Падрабязнасці — у найбліжэйшым нумары «Звязды».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

Блізкая ўлада

# Шырока і комплексна

## З якімі пытаннямі падчас прыёму грамадзян звярталіся да Ігара СЕРГЯЕНКІ

### «Патрэбен кансалідаваны орган»

Адно з пытанняў непасрэдна датычылася заканадаўчай дзейнасці. У пачатку снежня дэпутаты Палаты прадстаўнікоў у першым чытанні разгледзелі законапраект «Аб рыэлтарскай дзейнасці», які прадугледжвае пэўныя змяненні. Сваімі прапановамі, якія датычацца заканадаўства ў гэтай сферы, са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў падзялілася Алена Васільеўна, намеснік дырэктара сталічнай рыэлтарскай кампаніі. Па яе словах, у законапраекце ёсць шэраг спрэчных момантаў, якія патрабуюць удакладнення.

У прыватнасці, жанчына лічыць, што Палата рыэлтараў, якую плануецца стварыць, стане пасрэдніцкай структурай, што, па яе меркаванні, прывядзе да падаражання рыэлтарскіх паслуг. Пры гэтым заяўніца адзначыла, што рыэлтарскія кампаніі задавальняе орган-рэгулятар у гэтай сферы — Міністэрства юстыцыі. Акрамя таго, законапраектам прадугледжана скасаванне інстытута агентаў па аперацыях з нерухомасцю. Правам аказання рыэлтарскіх паслуг плануецца надзяліць толькі рыэлтараў, якія з'яўляюцца членамі Палаты рыэлтараў і маюць пасведчанне, выдадзенае Мінюстам па выніках здачы экзамену. Алена Васільеўна канстатавала, што на агентах па аперацыях з нерухомасцю ляжаць не менш важныя задачы, чым на рыэлтарах. Яна агучыла занепакоенасць сваю і сваіх калег: са скасаваннем агентаў кошт рыэлтарскіх паслуг можа вырасці, а якасць паслуг знізіцца. «Гэта ў большасці сваёй людзі працаздольнага ўзросту, якія складаюць рухальную сілу гэтай прафесіі, — звярнула ўвагу Алена Васільеўна, кажучы аб агентах па аперацыях з нерухомасцю. — Лічу атэстацыю агента па аперацыях з нерухомасцю для яго эканамічна затратнай, немэтазгоднай, бо яго работа не патрабуе глыбокіх ведаў у юрыспрудэнцыі».

У адпаведнасці з законапраектам, да прадстаўнікоў рыэлтарскай сферы не будуць прад'яўляцца патрабаванні да адукацыі. У цяперашні час займацца рыэлтарскай дзейнасцю маюць права людзі з вышэйшай юрыдычнай адукацыяй. З уступленнем у сілу змяненняў здзелкі з аб'ектамі нерухомасці змогуць праводзіць грамадзяне з вышэйшай адукацыяй любога профілю. Заяўніца лічыць гэта непрымальным: адсутнасць у рыэлтара юрыдычнай адукацыі, на яе думку, можа паўплываць на якасць паслуг.

«Вашы аргументы маюць пад сабой аснову, бо яны грунтуюцца на вашым асабістым вопыце, досведзе вашых калег, — звярнуў увагу Старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Вы своечасова прыйшлі: законапраект ужо прыняты ў першым чытанні, цяпер ідзе дашліфоўка, дапрацоўка з улікам меркаванняў супольнасці рыэлтараў. Наколькі я дасведчаны, на этапе да таго, як разглядзець яго ў першым чытанні, меркаванне вашых калег вывучалася. Аднак фактычна вашы прапановы поўнасцю аспрэчваюць асноўныя навацыі».

**Намеснік міністра юстыцыі Мікалай СТАРАВОЙТАЎ** паведаміў, што агучаныя заяўніцай пытанні абмяркоўваліся з удзелам парадку 300 рыэлтараў. «Меркаванні былі неадназначныя, але большасць рыэлтараў падтрымалі навацыі, у прыватнасці стварэнне Палаты рыэлтараў, — канкрэтызаваў ён. — Сёння ў гэтай супольнасці няма парадку (і ў частцы прымянення і іншага), шмат парушэнняў закона. У гэтым і праблема. Патрэбен кансалідаваны орган, які б штохвілінна, штодзённа працаваў бы з рыэлтарамі краіны». Прывёў аргументы намеснік міністра і на карысць іншых навяўвядзенняў, прадугледжаных законапраектам «Аб рыэлтарскай дзейнасці».

Рэзюмуючы, Ігар Сергеенка адзначыў, што дэпутаты дадаткова прапрацуюць мэтазгоднасць кожнага змянення, прадугледжанага заканадаўствам аб рыэлтарскай дзейнасці. Пытанне, як падкрэсліў спікер, будзе вывучана шырока і комплексна.

### Дарозе — быць

Яўген Іванавіч агучыў праблему жыхароў вёскі Рудня і некалькіх



пасёлкаў Лагойскага раёна, якія сутыкнуліся з дрэнным пад'ездам да сваіх населеных пунктаў. «Гравійка ў неналежным стане, як пральная дошка, 8—12 кіламетраў еду на другой перадачы», — канкрэтызаваў мужчына. Ен праінфармаваў, што ўжо звяртаўся з гэтым пытаннем у Лагойскі райвыканкам. Па выніках звароту была выкапана траншэя для адвядзення вады, для падсыпкі прывезлі дзве машыны пяску. Аднак усё гэта, па словах грамадзяніна, праблему не вырашыла: у дажджлівыя дні да дамоў жыхароў вёскі нават машына хуткай дапамогі не можа пад'ехаць.

Ігар Сергеенка ўдакладніў, колькі дамоў у вёсцы. Як высветлілася, у Рудні — 11, у суседніх пасёлках — па 8 і каля 20 адпаведна.

Для тлумачэння сітуацыі з дапамогай відэа-канферэнц-сувязі Ігар Сергеенка звярнуўся да старшыні Лагойскага райвыканкама Аляксандра Ласевіча. Кіраўнік Палаты прадстаўнікоў паставіў задачу вырашыць праблему з дарогай. «Пытанне трэба зняць, мы яго возьмем на кантроль», — звяртаючыся да раённых улад, агучыў даручэнне Старшыня Палаты прадстаўнікоў.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

*Таксама ў гэты дзень Ігар Сергеенка ў рамках акцыі «Моладзь для Беларусі» сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі юрыдычнага факультэта БДУ. Падрабязнасці сустрэчы — у найбліжэйшым нумары «Звязды».*

Надзвычайнае здарэнне

# «Усе вінаватыя павінны быць устаноўлены»

**Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КРУТОЙ правёў у Віцебску штаб з зацікаўленымі сілавымі ведамствамі. На парадку дня — арганізацыя работ па ліквідацыі наступстваў пажару ў гандлёвым цэнтры і ўстанаўленне прычын узгарання.**



13 снежня ў раёне 16 гадзін у гандлёвым цэнтры ў Віцебску пачаўся пажар. На месцы працавалі звыш 20 адзінак тэхнікі, каля 90 ратавальнікаў МНС. З будынка эвакуіравалі 215 чалавек, з якіх 40 — дзеці. У дзень здарэння 16 чалавек звярнуліся ва ўстановы аховы здароўя з фізічнымі траўмамі, яшчэ чатыры звярнуліся па псіхалагічную дапамогу, адна жанчына дагэтуль знаходзіцца на апараце ШВЛ. Падчас правядзення ратавальных работ пацярпелі два супрацоўнікі МНС. Узбуджана крымінальная справа па факце парушэння правілаў пажарнай бяспекі.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, нават знаходзячыся ў замежнай камандзіроўцы, узяў надзвычайнае здарэнне ў Віцебску пад асабісты кантроль і даручыў адказным асобам дэталёва разабрацца ў прычынах трагедыі.**

**Кіраўнік Адміністрацыі Дзмітрый Крутой ужо ў панядзелак з раніцы сабраў штаб у Віцебскім аблвыканкаме.**

Пачынаючы работу штаба, Дзмітрый Крутой падкрэсліў: па даручэнні Прэзідэнта павінна быць праведзена максімальна поўнае расследаванне ўсіх абставін таго, што адбылося. «Усе вінаватыя павінны быць, безумоўна, устаноўлены. Ніхто нікога пакрываць, прыкрываць, адмазваць не будзе, таму і па лініі ўладальнікаў, арганізатараў гэтага бізнесу, гэтага цэнтра, і па лініі ўсіх адказных ведамстваў усе вінаватыя, безумоўна, будуць устаноўлены», — падкрэсліў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Дзмітрый Мікалаевіч дадаў, што ад арандатараў неадночы паступалі скаргі, і пацікавіўся, чаму на гэтыя звароты ніхто не рэагаваў. З гэтымі пытаннямі будуць разбірацца.

«Характар развіцця пажару і наступствы маглі быць зусім іншыя. Для нас гэты выпадак павінен стаць урокам, і мы павінны зрабіць пэўныя высновы, папярэджваючы падобныя сітуацыі на будучыню. Прэзідэнт сказаў, што мы як быццам вярнуліся ў 1990-я гады, калі такі раздрай, такія аб'екты непрывабнага выгляду ў цэнтры Віцебска. Чаму яны існуюць да гэтага часу, хто даваў дазвол на іх будаўніцтва, увод у эксплуатацыю?» — звярнуўся да мясцовых улад Дзмітрый Крутой.

Аналізуючы ход падзей 13 снежня, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта выказаў словы падзякі ратавальнікам, своечасовае прыбыццё на месца якіх дапамагло пазбегнуць чалавечых ахвяр. Ён прывёў у прыклад супрацоўніка МНС, у якога скончыўся кісларод у кіслародным балоне, але мужчына працягнуў ратавальную аперацыю, праз што сам трапіў у бальніцу. Словы падзякі былі накіраваны і ў адрас медыкаў, у тым ліку і рэспубліканскіх, якія аператыўна прыбылі на дапамогу віцебскім калегам.

У найбліжэйшую пятніцу павінна быць падрыхтавана справаздача Прэзідэнту аб першасным расследаванні прычын, абставін таго, што адбылося, з адпаведнымі высновамі. Далей — працэс у рамках узбуджанай крымінальнай справы па артыкуле, звязаным з парушэннем правілаў пажарнай бяспекі. Па меры паступлення матэрыялаў экспертыз магчыма перакваліфікацыя.

Дзмітрый Крутой папрасіў максімальна адказна паставіцца да гэтага выпадку не толькі як да інцыдэнту, але і як да сітуацыі, з якой неабходна зрабіць пэўныя высновы абсалютна па ўсіх ведамствах. Важны момант, на якім, па словах Крутога, асобна заастрыў увагу Прэзідэнт, — інфармацыя павінна быць сабрана старанна, пастурова, па крупінках, каб пазбегнуць выдуманых на пустым месцы фэйкаў.

Работа экспертаў-крыміналістаў толькі пачалася, аднак ужо пачынаюць раскрывацца пэўныя падрабязнасці, звязаныя з сістэмай электразабеспячэння гэтага аб'екта, са шматлікімі незаконнымі перапланіроўкамі крам, дзе працавалі арандатары, з парушэннямі фінансава-эканамічнай дзейнасці суб'екта, і шэраг іншых напрамкаў. У сувязі з тым, што ва ўласніка гандлёвага цэнтра ў Віцебску знаходзіцца яшчэ шэраг аб'ектаў, яны будуць таксама падвергнуты дбайнай праверцы і рэвізіі.

У пажары сур'ёзна пацярпелі перакрыцці будынка, які быў узведзены ў 1972 годзе, таму ён, верагодна, будзе падлягаць зносу, агучыў Дзмітрый Крутой. «На гэтым месцы будзе прапанавана зрабіць іншы аб'ект, які больш адпавядае цэнтральнай частцы абласнога цэнтра. Што датычыцца індывідуальных прадпрымальнікаў, то цяпер на ўзроўні мэрыі Віцебска створана каардынацыйная група, якая працуе з імі. Мы імкнёмся зразумець, якая частка маёмасці была застрахавана і падлягае класічнай кампенсацыі за кошт страхоўкі. Але, хутчэй за ўсё, асноўная маса людзей, у якіх пацярпелі і дакументы, у тым ліку падатковыя, разлічвае на тую ці іншую форму кампенсацыі», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі.

**Пасля заканчэння пасяджэння штаба міністр МНС Вадзім СІНЯЎСКІ сустрэўся з супрацоўнікамі ведамства, якія ўдзельнічалі ў ліквідацыі пажару ў гандлёвым цэнтры. Аднаго з пацярпелых ратавальнікаў пажарнай аварыйна-ратавальнай часці № 1 Віцебскага гараддзела МНС Канстанціна Гіркалу міністр наведаў у бальніцы. «Дзякуй богу, жывы-здаровы, ідзеш на папраўку! Урачы гавораць, што надоўга тут не затрымаешся. Твой таварыш, які таксама пацярпеў (яму ўвогуле нагу зашылі), не паспеў апрытомнець — надзеў баявое адзенне і вярнуўся на месца здарэння. Гэта яшчэ раз паказвае адносіны ратавальнікаў да чалавечага жыцця. Дзякуй вялікі!» — адзначыў Вадзім Сіняўскі.**

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.**



Фота БелТА.

## Задача ад Першага

*Мінская вобласць сёння — адзін з лідараў у прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Але давайце будзем шчырымі: гэта, як часта кажуць, сярэдняя тэмпература. Вы здольныя на большае. За спінамі лідараў мінскай «перапрацоўкі» яшчэ хапае прадпрыемстваў, якім неабходна ўзяць на сябе, мякка кажучы, павышаныя абавязацельствы.*

*Аляксандр Лукашэнка на свяце ўшанавання працаўнікоў вёскі «Дажынкі» ў Валожыне.* 19 кастрычніка 2024 года.

# НЕ ТОЛЬКІ МАЛАКО І МЯСА...

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН:**

— Кіраўнік дзяржавы не раз агучваў тэзіс, што трэба глядзець на вытворчасць той прадукцыі, якая з'яўляецца, можа быць, не зусім традыцыйнай у нашым разуменні. Гэта не толькі малако і мяса буйной рагатай жывёлы. Сёлета ў вобласці рэалізаваны два праекты, я лічу, знакавыя для нашай краіны. Гэта Салігорская птушкафабрыка, перапёлкавая ферма, хоць фермай назваць яе складана. Гэта вялікае прадпрыемства, найбуйнейшае на прасторах былога Савецкага Саюза, якое будзе забяспечваць вялікія аб'ёмы вытворчасці перапёлчыных яек. Гэта тая ніша, у якой птушкафабрыка фактычна будзе з'яўляцца манапалістам.



Фота БелТА.

Яшчэ адзін такі прыклад — агракамбінат «Дзяржынскі». У Капыльскім раёне быў рэалізаваны праект па вытворчасці мяса індычкі. Сёння мы бачым, што спажыванне індычкі на душу насельніцтва як у нашай краіне, так і за яе межамі ўзрастае. Спажыванне мяса індычкі ў Расійскай Федэрацыі на душу насельніцтва больш чым у два з лішнім разы апярэджвае Беларусь, не кажучы ўжо пра Польшчу, дзе мы адстаём па спажыванні не ў адзін раз. Гэта, зноў жа, тая ніша, што сёння дазваляе нам з упэўненасцю глядзець у будучыню і ведаць, што прадукцыя, якую мы пачалі выраблюць, будзе запатрабавана. Гэта насамрэч здаровае харчаванне, што таксама немалаважна для нашых людзей.

У галіне малочнай жывёлагадоўлі мы ўжо не першы год рухаемся па вызначанай стратэгіі будаўніцтва новых сучасных малочнатаварных комплексаў, выконваючы тыя даручэнні, якія даваў Прэзідэнт нашай краіны. І мы бачым, на які вынік павінны выйсці. У далейшых планах — развіццё свінагадоўлі. Наша задача — у найбліжэйшую пяцігодку паставіць усё пагалоўе свіней на сучасныя комплексы. Гэта не проста даніна модзе, а магчымасць атрымаць неабходныя фінансавыя вынікі для эканамічна эфектыўнай работы гэтай галіны.

У вобласці ёсць цэлы шэраг маштабных праектаў па малочнай і мясной перапрацоўцы. У нас рэалізоўваюцца тыя праекты, якіх яшчэ не было ў нашай краіне. Вытворчасць лактаферыну на Слуцкім сырабробным камбінаце і іншыя праекты дазволяць атрымліваць дадатковую выручку і прыбытак з нашага малака і мяса, забяспечыўшы і харчовую бяспеку нашай краіны, і паступленне валютнай выручкі, і эфектыўныя ды высокааплатныя працоўныя месцы.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# У РЫТМЕ АДЗІНСТВА

## Рэспубліканская грамадска-культурная акцыя паспяхова прайшла ў Баранавічах і ўзяла курс на Брэст

**Баранавічы сустракалі «Марафон адзінства» з сонцам і першым марозікам, а яшчэ з мноствам усмешак, прыемным здзіўленнем, добрымі эмоцыямі. Марафон закончыўся, але засталіся незабыўныя ўражанні, цёплыя ўспаміны, а ў некаторых — і новыя веды, бо акцыя, як заўсёды, была вельмі інфармацыйна насычанай. Аб гэтым і не толькі — у рэпартажы з марафону ў Баранавічах.**



Жыхароў Баранавічаў і гасцей канцэрта прывітаў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ**: «Думаю, для большасці беларусаў Баранавічы асацыіруюцца менавіта з чыгункай. У вас і на гербе паравоз, і ў горадзе два чыгуначныя вакзалы. Ваша аддзяленне чыгункі перавозіць 30 працэнтаў грузаў унутры Беларусі...»

Яшчэ Дзмітрый Крутой згадаў, што ёсць нямала версій паходжання назвы горада Баранавічы: «Але, на мой погляд, самая правільная — ад слова «бараніць», ахоўваць. Горад, нягледзячы на сваю маладосць (вам крыху больш за 150 гадоў) шмат разоў трымаў абарону. Свой след пакінула Першая сусветная вайна. Падчас Вялікай Айчыннай вайны Баранавічы былі моцна разбураны і панеслі вялікія страты. Сёлета Прэзідэнт узнагародзіў Баранавічы спецыяльным вымпелам «За мужнасць у гады Вялікай Айчыннай вайны».

Кіраўнік адміністрацыі абазначыў найбліжэйшую задачу 170-тысячнаму гораду — сур'ёзна прыбавіць у прамысловым развіцці.

### У горадзе прамыслоўцаў і чыгуначнікаў

Горад стаў дзявятым на маршруце рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі. На працягу двух дзён — 13 і 14 снежня — удзельнікі атрымалі магчымасць пазнаёміцца з баранавіцкімі прадпрыемствамі, цікавымі людзьмі, а яшчэ адчуць атмасферу агульнага драйву, які аб'ядноўвае. «Марафонцы» даведаліся, што Баранавічы — гэта горад прамыслоўцаў, чыгуначнікаў, авіятараў, які імкліва развіваецца. Усё пералічанае знайшло адлюстраванне ў праграме мерапрыемства.

Традыцыйныя праекты «Разам працуем, разам спяваем» і «Адну справу робім» ахапілі многія прадпрыемствы прамысловага горада. Журналісты, блогеры, артысты пабывалі на Баранавіцкім вытворчым баваўняным аб'яднанні, на Баранавіцкім аўтаагрэгатным заводзе, а таксама на станкабудаўнічым заводзе, філіяле закрытага акцыянернага таварыства «Атлант», у лакаматыўным дэпо. І паўсюль гэтыя сустрэчы прайшлі шчыра, душэўна. Госці атрымалі рэдкую магчымасць паглядзець на вытворчы працэс, а работнікам выпала магчымасць у цэхах пабываць на маленькіх канцэртах знакамітых артыстаў. Добры настрой дарылі Аляксандра Гайдук, спявачкі Жанет, Гюнэш, іншыя вакалісты.



### За дыктатуру парадку

Традыцыйна адной з адметных падзей грамадска-культурнай акцыі стала «Знакавая сустрэча». У будынку чыгуначнага вакзала «Баранавічы Палескія» сабралася шмат людзей, відаць, таму, што прозвішчы спікераў былі аб'яўлены загадзя. На сустрэчу прыехалі **міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Марат МАРКАЎ, журналіст, палітычны аглядальнік Ігар ТУР, радыёвядучы Вадзім ШЭПЕТ**. Тэма размовы была абазначана так: «Дыктатура — міфы і рэальнасць».

На самым пачатку Ігар Тур правёў невялічкі «лікбез», расказаў, што такое дыктатура і аўтарытарная форма кіравання дзяржавай. Паводле яго вызначэння, у нас якраз аўтарытарная форма кіравання, а дыктатура ў нас — гэта механізм рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі. А як усё працуе, патлумачыў папулярна на побытавым прыкладзе: «У мяне расце сын, якому ў студзені будзе два гады. Дык вось ён бярэ бутэлечку і спрабуе разліць ваду на падлогу. Я не дазваляю, забіраю бутэльку. Бо калі ён разалье, потым будзе бегаць, паслізнецца, упадзе, наб'е гузакі... Ён плача. З пункту гледжання сына, я, напэўна, дыктатар, бо не дазваляю яму зрабіць тое, што ён хоча. Але ж варта разабрацца і прызнаць, што дыктатарскі інструмент рэалізацыі маёй бацькоўскай палітыкі пайшоў на карысць. У дзяржаве таксама часам трэба прымаць непапулярныя рашэнні на карысць усіх членаў грамадства».

«...Калі ідзе гаворка пра дыктатуры, аўтакратыі, дэмакратыі, варта ўлічваць, што гэта толькі форма ўлады, а не яе змест, — гаварыў Ігар Тур. — Ёсць добрыя дыктатуры і дрэнныя, добрыя і дрэнныя аўтарытарныя рэжымы, добрыя і дрэнныя дэмакратыі. Усё залежыць ад таго, у каго рэальная ўлада, таму трэба ацэньваць саму ўладу, а не форму яе рэалізацыі. Ацэньваць уладу па форме не выглядае разумным. Лічу, у нас самая прымальная для славян форма, калі мы дакладна разумеем, хто ў нас галоўны. Наогул, нам пашанцавала, што ў 1994 годзе да ўлады прыйшоў Аляксандр Лукашэнка і ўсталяваў дыктатуру для рэалізацыі сваіх ідэй, накіраваных на развіццё дзяржавы. Паліталагічна ў нас аўтарытарны рэжым, які рэалізоўваецца з дапамогай дыктатарскіх рашэнняў. А без гэтых рашэнняў мы нарабілі б кучу такіх спраў, якія дакладна пайшлі б не на карысць».

Міністр інфармацыі Марат Маркаў падкрэсліў важнасць парадку ў дзяржаве. «Калі мы гаворым пра дыктатуру, то чаму б не паставіць знак роўнасці паміж гэтым словам і парадкам. З гісторыі мы ведаем, да чаго прыводзіць адсутнасць парадку. Варта ўспомніць канец 1980-х гадоў і пачатак 1990-х, — працягваў Марат Маркаў. — Калі ўлада аказалася ў руках «дэмакратычных» людзей, краіна паглыбілася ў бардак

> **Нам пашанцавала, што ў 1994 годзе да ўлады прыйшоў Аляксандр Лукашэнка і ўсталяваў дыктатуру для рэалізацыі сваіх ідэй, накіраваных на развіццё дзяржавы.**

і безуладдзе. Мы гэта бачылі на прыкладзе нацыянальных канфліктаў, хаатычнай прыватызацыі, пустых паліц, талонаў, купонаў, валюты, якая не з'яўлялася паўнавартасным разліковым сродкам. А ўсё з-за таго, што нехта хацеў прыгожа тусавацца на Захадзе, як сказалі ў адным вядомым фільме».

Яшчэ міністр згадаў свой асабісты досвед 1991 года. Менавіта тады ён, малады афіцэр, выпускнік ваеннага вучылішча, прыехаў у горад Капусцін Яр Астраханскай вобласці і ўбачыў абсалютна пустыя паліцы ў крамах. «А другі момант, калі пачаўся вывад савецкіх войск з Германіі, туды, да нас, сталі прыбываць вайскоўцы цэлымі палкамі. І сем'і афіцэраў, якія адслужылі дзясятак ці больш гадоў, сяліліся ў палатках, а на двары бывала да мінус 35. І гэта ўражанне, якое не сціраецца з памяці, такое нельга забыць», — заўважыў спікер.

І працягнуў: «У Беларусь я вярнуўся ў 1993 годзе. Добра памятаю шкарпэткі па талонах, чэргі, якія трэба было займаць з ночы. І ўсё гэта было наступствамі безуладдзя. Цяпер думаю: вельмі шкада, што няма ў нас машыны часу. А то б варта было адправіць у 90-я тых, хто вельмі захацеў перамен у 2020 годзе. Я б паглядзеў, колькі яны б там «працягнулі» і калі б папрасіліся назад. Таму калі я гавару пра дыктатуру, то маю на ўвазе найперш парадак. Чаму наводзіць парадак у кватэры, доме, двары нармальна, а ў дзяржаве — не? Гэта падмена паняццяў, якія нам спрабуюць навязаць. Варта не паддавацца на гэтыя спробы. Таму я за парадак заўсёды і ва ўсім».

Сустрэча прайшла цікава, ажыўлена, раўнадушных у гэтай аўдыторыі дакладна не заставалася.



### Згода — у працы ды імкненні захоўваць

Як не было іх і на іншых лакацыях «Марафону адзінства». Гараджан загадзя запрашалі на пляцоўку каля Лядовага палаца, дзе размясцілася выстава прадпрыемстваў, устаноў, якія прапаноўвалі пачастункі і забаўлянкі. Хто прыйшоў — не пашкадаваў. Не раз падчас акцыі гучала, што Баранавічы — горад чыгуначнікаў. І адразу з Савецкага праспекта гасцей і ўдзельнікаў марафону сустракаў паравоз, дакладней, стылізаваны аналаг першага паравоза, які прайшоў па чыгунцы ў 1871 годзе. Названую фотазону зрабілі баранавіцкія чыгуначнікі.

А ў першым ад паравоза павільёне разгарнулася невялікая экспазіцыя Музея чыгункі ў Баранавічах. Як высветлілася, музей быў створаны 14 снежня 1984 года. І карэспандэнт «Звязды» з задавальненнем павіншавала яго супрацоўнікаў з юбілеем. А яны правялі невялікую экскурсію для аўтара гэтых радкоў і тых, хто аказаўся побач. Наталля Ярош, малодшы навуковы супрацоўнік музея, расказала, што заснавальнікамі былі тагачасныя галоўны інжынер Ілья Малюгін і начальнік Баранавіцкага аддзялення чыгункі Анатоль Ільін: «Аднойчы начальнік сказаў інжынеру: «А давайце гэту гісторыю захаваем!» Так пачалі збіраць звесткі, экспанаты, дакументы, пакуль не атрымаўся сапраўдны музей, і работа працягваецца дагэтуль. «Сёння пасыл — «Давайце захаваем гісторыю» — гучыць вельмі актуальна. А праца — тое, што нас па-сапраўднаму аб'ядноўвае, нашы калектывы заўсёды служаць нам плячом, якое падтрымае. Таму наша адзінства — у працы і жаданні захоўваць і памнажаць», — заключыла работнік музея.

Павільён Івацэвіцкага раёна сабраў шмат наведвальнікаў перш за ўсё дзякуючы не зусім звычайнаму персанажу. Тут гасцей вітаў партызанскі Дзед Мароз з мемарыяльнага комплексу «Хаваншчына». Дзядуля ўсім жадаў міру ды частаваў гарачым чаем на травах. А Івацэвіцкі лясгас прадаваў ёлкі ў кадушках, каб пасля Новага года перасадзіць на ўчастку.

Сваімі ўражаннямі з карэспандэнтам газеты падзялілася жыхарка Баранавічаў Антаніна Аблажэй: «Я прыйшла з унукам, які даўно марыў убачыць гоначны аўтамабіль МАЗ. Унук — фанат нашай каманды, ведае ўсе ралі, сочыць за спаборніцтвамі. А тут яшчэ можна было ўжывую ўбачыць членаў каманды. Ваня ў захапленні. У суседзяў унучка займаецца балетам у харэаграфічнай школе. Шчаслівыя, бо Анечка змагла ўбачыць нашых праслаўленых майстроў балета, напрыклад, саму Ірыну Яромкіну. І ўсё дзякуючы марафону».

Тым часам набіраў разгон квэст «Гэта ўсё маё роднае». Моладзь веселілася, каманды актыўна адказвалі на пытанні раздзелаў-станцый.

### Баранавічам — прамысловага росту, Брэсту — марафон

Фінальны канцэрт «Час выбраў нас», як заўсёды, прайшоў на вышыні. Легендарная «Белавежская пушча» ў выкананні Беларускага дзяржаўнага ансамбля «Песняры» прагучала прыгожай настальгічнай ноткай канцэртнай праграмы. А кампазіцыя «Пакінуць след» глыбока кранула сваёй высокай патрыятычнай нотай. Цудоўна паказалі сябе калектывы Брэстчыны.

Аб тым, што Баранавічы знаходзяцца на старце прамысловага росту, заявіў у сваёй кароткай прамове **старшыня Брэсцкага аблвыканкама Пётр ПАРХОМЧЫК**. Кіраўнік вобласці адзначыў, што Баранавічы з'яўляюцца буйным прамысловым, адукацыйным, культурным, транспартным і лагістычным цэнтрам.

«Баранавічы прымалі «Марафон адзінства» 13–14 снежня, наступны на чарзе — Брэст. Яго чакае гэты цудоўны марафон, рыхтуемся,» — сказаў губернатар.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

**Фота БелТА.**

Сацыяльны клопат

# У Беларусі стартавала дабрачынная акцыя «Нашы дзеці»

**Падчас акцыі вышэйшыя службовыя асобы дзяржавы, кіраўнікі рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, дзяржаўных і іншых арганізацый, прадстаўнікі грамадскіх аб'яднанняў наведваюць больш за 130 устаноў, сярод якіх дзіцячыя інтэрнатныя ўстановы, арганізацыі аховы здароўя, цэнтры карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі, установы адукацыі, дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Галоўная мэта дабрачыннай акцыі — дайсці да кожнага дзіцяці, каб усе адчулі свята. Традыцыйна акцыя праходзіць на працягу месяца.**




Таксама ў рамках акцыі Беларускі дзіцячы фонд будзе праводзіць марафон па зборы грашовых сродкаў на аказанне медыцынскай дапамогі дзецям з захворваннямі сэрца. Добраахвотныя ахвяраванні і пералічэнні, якія паступяць ад людзей, прадпрыемстваў, арганізацый і грамадскіх аб'яднанняў, пойдуць на лячэнне дзяцей з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі.

Традыцыйна цэнтральнай падзеяй мерапрыемства стане дабрачыннае навагодняе свята ў Палацы Рэспублікі. На галоўную ёлку краіны запрошаны амаль 2,4 тысячы дзяцей ва ўзросце 8—14 гадоў з усіх рэгіёнаў Беларусі. Не менш значнай падзеяй стане і навагодні баль для моладзі ў Палацы Незалежнасці, куды запрошаны больш як 300 навучэнцаў устаноў адукацыі — школьнікі, навучэнцы каледжаў, студэнты.

Як і раней, актыўны ўдзел у віншаваннях дзяцей прыме студэнцкая моладзь. Валанцёры з Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Магілёўскага, Гомельскага, Брэсцкага, Мазырскага педагагічных універсітэтаў і іншых устаноў адукацыі наведаюць установы аховы здароўя, інтэрнатныя ўстановы, дзе арганізуюць для дзяцей гульнявыя і віншавальныя праграмы.

Вядома, усе дарослыя, якія ўдзельнічаюць у акцыі, прыйдуць да дзяцей не з пустымі рукамі. Яны прынясуць салодкія пачастункі, падарункі, тое, што менавіта сёння патрэбна кожнай канкрэтнай арганізацыі або ўстанове.

Прадоўжыцца дабрачынная акцыя да 15 студзеня 2025 года.

**Паводле БелТА.**

# УСЯ КРАІНА НА ЭКРАНЕ КАМП'ЮТАРА

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

У катэгорыі «Грамадзянства, пашпарт, ID-карта» сабраны 28 электронных паслуг, якія дазваляюць як атрымаць звесткі, што адсутнічаюць на ID-карце, так і праверыць легітымнасць і сапраўднасць дакументаў. А электронныя сэрвісы, размешчаныя ў катэгорыі «Мяжа і мытня», дазваляюць хутка, не выходзячы з дому, атрымаць пропуск на права ўезду ў пагранічную паласу, а таксама дазвол на ажыццяўленне там гаспадарчай дзейнасці. Усяго ў гэтай катэгорыі 39 паслуг і 35 працэдур.



## ЯК ПРАВЕРЫЦЬ РЭПУТАЦЫЮ ПАРТНЁРА?

Сярод 14 паслуг і 99 адміністрацыйных працэдур у катэгорыі «Дакументы» адна з самых папулярных — па праверцы добранадзейнасці дзелавой рэпутацыі. Яна дае магчымасць атрымаць разгорнутую інфармацыю аб арганізацыі: ад агульнай інфармацыі аб суб'екце гаспадарання (поўнае найменне юрыдычнай асобы, прозвішча і імя індывідуальнага прадпрымальніка, УНП, тып, стан, дата рэгістрацыі суб'екта гаспадарання) да інфармацыі аб наяўнасці / адсутнасці запазычанасці перад бюджэтам, звестак па справах аб эканамічнай неплацежаздольнасці (банкруцтве), відах падаткаў, што выплачваюцца, і г. д.

Даступная інфармацыя аб сярэдняй колькасці работнікаў, звесткі гадавой бухгалтарскай і (або) фінансавай справаздачнасці і многае іншае, расказала спецыяліст.

— Таксама сярод папулярных паслуг — «Прадастаўленне звестак для выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў», — адзначае яна. — Сэрвіс размешчаны ў катэгорыі «Ахова здароўя». Паслуга распрацавана па ініцыятыве Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь і ўведзена ў 2022 годзе. Сэрвісам могуць карыстацца як грамадзяне, так і медыцынскія работнікі для выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных хвароб сістэмы кровазвароту, анкалагічных захворванняў, хранічных абструктыўных захворванняў лёгкіх, цукровага дыябету.

## ЗАРЭГІСТРАВАЦЬ НЕРУХОМАСЦЬ — У НЕКАЛЬКІ КЛІКАЎ

— Сёлета «ў лічбу» пераведзены электронныя паслугі і адміністрацыйныя працэдуры Дзяржаўнага мытнага камітэта, якія дазваляюць прадстаўляць мытным органам пасажырскую мытную дэкларацыю ў выглядзе электроннага дакумента. Паслуга даступна фізічным і юрыдычным асобам, — падводзіць вынікі года суразмоўніца. — Адзіны партал электронных паслуг «Е-Паслуга» папоўніўся больш чым 30 новымі адміністрацыйнымі працэдурамі Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Карыстальнікам будуць цікавыя сэрвісы Міністэрства транспарту і камунікацый Рэспублікі Беларусь, якія дазваляюць атрымліваць дазвол на допуск транспартнага сродку да ўдзелу ў дарожным руху. Не так даўно на партале «Е-Паслуга» з'явілася зусім новая катэгорыя «Аб'екты прамысловай уласнасці», у якой дзевяць падкатэгорый, і ў кожнай размешчаны адміністратыўныя працэдуры.

Таксама алічбаваны адміністрацыйныя працэдуры па рэгістрацыі дагавораў куплі-продажу нерухомасці, падзелу зямельнага ўчастка, правоў на нерухомасць (зямельныя ўчасткі, дамы, ізаляваныя памяшканні, машыначмесцы), па выдачы выпісак і даведак аб правах на нерухомасць.

> **На «лічбавыя рэйкі» наша грамадства пераходзіць досыць хутка, канстатуюць у НЦЭУ. Калі ў 2021 годзе праз адзіны партал электронных паслуг было аказана 17,5 мільёна паслуг, у 2022 годзе — больш за 76 мільёнаў, у 2023 годзе — каля 128 мільёнаў, то сёлета штомесяц аказваецца каля 11 мільёнаў электронных паслуг.**

## «Е-ПАСЛУГА» — І Ў СМАРТФОНЕ

Мабільны дадатак «Е-Паслуга» з'явіўся ў снежні 2023 года. Такім чынам, у яго — першы «юбілей».

— Доступ да большасці электронных паслуг на партале патрабуе адназначнай строгай ідэнтыфікацыі карыстальніка, якая магчыма пры наяўнасці электроннага лічбавага подпісу або ID-карты, — тлумачыць Мая Ендэладзэ. — Але пры выкарыстанні ID-карты (калі заходзіць на партал з камп'ютара) вам спатрэбіцца дадатковая прылада — счытвальнік. Каб спрасціць працэдуру аўтарызацыі па ID-карце і атрымаць доступ да электронных паслуг, НЦЭУ распрацаваў мабільны дадатак «Е-Паслуга», у якім счытвальнікам з'яўляецца мабільны тэлефон (з функцыяй NFC). Дастаткова прыкласці ID-карту да тыльнага боку смартфона, увесці PIN 1 — і вы актывуеце свой асабісты кабінет на «Е-Паслуга».

Пакуль мабільны дадатак «Е-Паслуга» даступны для выкарыстання толькі фізічнымі асобамі і толькі для сістэмы Android. Спампаваць дадатак можна ўжо сёння ў Google Play, Huawei AppGallery, Android RuStore. З моманту запуску дадатку (20.12.2023) зафіксавана больш за 10 000 яго ўстановак.

Дарэчы, стаць карыстальнікам «Е-Паслуга» можна, і не маючы ID-карты: аўтарызуйцеся па нумары тэлефона, e-mail, уліковых запісах у Google, Apple або з дапамогай унікальнага ідэнтыфікатара.

## УНІКАЛЬНЫ ІДЭНТЫФІКАТАР

Гэта распрацоўка — яшчэ адзін спосаб строгай аўтэнтыфікацыі на партале «Е-Паслуга» нараўне з выкарыстаннем электроннага лічбавага подпісу або ID-карты.

— Унікальны ідэнтыфікатар уяўляе сабой паслядоўнасць сімвалаў, ідэнтычную ідэнтыфікацыйнаму нумару, указанаму ў дакуменце, што сведчыць асобу грамадзяніна, — канкрэтызуе прэс-сакратар НЦЭУ. — Выдаецца ён службамі «адно акно» бясплатна, на падставе асабістага звароту грамадзяніна з адпаведнай заявай, пры прад'яўленні ім дакумента, які сведчыць асобу, пасля зверкі даных аб грамадзяніне са звесткамі, што змяшчаюцца ў дзяржаўных інфармацыйных рэсурсах Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь.

З амаль 640 відаў электронных паслуг і адміністрацыйных працэдур, даступных сёння для грамадзян і бізнесу, наяўнасць унікальнага ідэнтыфікатара дае магчымасць выкарыстоўваць больш за 400. Не даступныя толькі тыя, што патрабуюць падпісання ў электронным выглядзе запытаў, дакументаў, заяў.

## ДЫЯЛОГ ГРАМАДСТВА І ДЗЯРЖАВЫ

На «лічбавыя рэйкі» наша грамадства пераходзіць досыць хутка, канстатуюць у НЦЭУ. Калі ў 2021 годзе праз адзіны партал электронных паслуг было аказана 17,5 мільёна паслуг, у 2022 годзе — больш за 76 мільёнаў, у 2023 годзе — каля 128 мільёнаў, то сёлета штомесяц аказваецца каля 11 мільёнаў электронных паслуг. Што датычыцца планаў на будучыню, па-ранейшаму ў прыярытэце распрацоўка новых электронных сэрвісаў на партале, якія дазваляюць яшчэ большую колькасць запатрабаваных вырашаць у адзін клік, без неабходнасці збору пакетаў дакументаў і чакання ў чэргах, адзначаюць спецыялісты НЦЭУ.

— Працягваем працаваць над стварэннем хуткіх і дакладных працэдур ідэнтыфікацыі асобы, зручнасцю выкарыстання электроннага лічбавага подпісу (ЭЛП). Так, сёння ідзе работа па стварэнні ў нашай краіне інфраструктуры воблачнага ЭЛП, — тлумачыць Мая Ендэладзэ. — Воблачны ЭЛП стане годным інструментам паўсядзённага ўзаемадзеяння грамадзян і бізнесу з дзяржавай і паміж сабой, які не патрабуе дадатковых тэхнічных сродкаў.

Акрамя таго, сёння спецыялісты НЦЭУ працуюць над стварэннем адзінай платформы інтэраперабельнасці (то-бок сумяшчальнасці) інфармацыйных рэсурсаў і сістэм. Гэтыя і іншыя значныя задачы ставіць Дзяржаўная праграма развіцця лічбавай эканомікі і інфармацыйнага грамадства на 2021—2025 гады, асноўная мэта якой — зразумелы і прадукцыйны лічбавы дыялог паміж бізнесам, грамадствам і дзяржавай, падвяла вынік прадстаўнік Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

# «Нам ёсць куды расці»

## На што накіравана ўвага зеленакласнікаў у Мінску

**Вось амаль і скончыўся 2024 год. Час падвесці вынікі выкананай працы і запланаваць тое, што хацелася б рэалізаваць у будучыні. Чым запомніўся гэты год удзельнікам адукацыйнага праекта «Зялёныя класы беларускай сталіцы», якія мерапрыемствы будуць арганізаваны ў новым 2025 годзе, расказаў дырэктар Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця Руслан ШАЙКІН.**



Фота Руслана ШАЙКІНА.



Фота Зоі САЛАЎЁВАЙ.

Адукацыйны праект «Зялёныя класы беларускай сталіцы», які рэалізоўваецца Цэнтрам экалагічнага выхавання і развіцця сумесна з Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, накіраваны на знаёмства маладога пакалення мінчан з навакольным асяроддзем, прывіццё ім высокага ўзроўню экалагічнай культуры. Адукацыйная праграма ўключае даследчы, асветніцкі і практычны кампаненты. У асноўным удзельнікі праекта — навучэнцы пачатковых класаў, аднак спецыялісты цэнтра імкнуцца, каб іх экалагічная асвета працягвалася.

— За гэты год мы правялі шмат мерапрыемстваў, прымеркаваных да розных экалагічных дат: Сусветнага дня водных рэсурсаў, Міжнароднага дня біялагічнай разнастайнасці, Міжнароднага дня птушак і інш. Заняткі, фестывалі, конкурсы, паходы — мы імкнуліся не прапусціць ніводнага экалагічнага свята. Напрыклад, 2 лютага адзначаецца Сусветны дзень водна-балотных угоддзяў. Увага зеленакласнікаў была накіравана ў першую чаргу на мінскія вадаёмы: раку Свіслач, Чыжоўскае вадасховішча, Сляпянскую водную сістэму. На Сусветны дзень запаведнікаў і нацыянальных паркаў (11 студзеня) паехалі ў Бярэзінскі біясферны запаведнік. Нярэдка самі праводзім там для дзяцей экскурсіі. Дарэчы, у наступным годзе плануем нават арганізаваць тут фестываль «зялёных класаў». Хочацца, каб, акрамя наведвання музея і экасцежак, быў яшчэ і элемент свята: забаўляльныя мерапрыемствы, песні, магчыма, і дзіцячая дыскатэка. Яшчэ ў найбліжэйшай перспектыве плануем заключыць з запаведнікам дагавор аб супрацоўніцтве, — расказаў Руслан Шайкін.

Паводле яго слоў, асаблівая ўвага ў рамках праекта — пашырэнню дзіцячага кругагляду. Дзякуючы выязным экскурсіям закранаюцца тры кампаненты: экалагічны — вывучэнне прыроды новай мясцовасці, гістарычны — знаёмства дзяцей з дасягненнямі культуры Беларусі, наведванне замкаў і іншых архітэктурных славутасцяў краіны, патрыятычны — паездкі па памятных месцах Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, у Цэнтры экалагічнага турызму «Станькава», куды неяк прыязджалі зеленакласнікі, акрамя заапарка, ёсць партызанскі лагер. Гэта рэканструкцыя будынкаў, створаных у натуральную велічыню ў адпаведнасці з дакументальнымі крыніцамі пра Вялікую Айчынную вайну.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

— Мы звяртаем увагу дзяцей на тое, што вялікай перавагай партызан было дасканалае веданне мясцовасці: дзе знаходзяцца непраходныя зараснікі, дзе размешчана балота, якая зямля на той ці іншай тэрыторыі, ці можна зрабіць там падземны лагер, — растлумачыў дырэктар Цэнтра экалагічнага выхавання і развіцця. Цікава, што выязныя мерапрыемствы ніколі не абмяжоўваюцца адной экскурсіяй або наведваннем заапарка. У любую паездку ўдзельнікі праекта ўносяць свае «зеленакласныя» элементы: назіраюць за той ці іншай птушкай, вывучаюць расліннасць новай мясцовасці, згадваюць, што абмяркоўвалася на занятках. Заняткі не толькі знаёмяць школьнікаў з прыродай роднага краю, але і выхоўваюць беражлівае стаўленне да навакольнага асяроддзя.

***— З якімі партнёрамі былі праведзены мерапрыемствы ў 2024 годзе?***

— «Зеленакласнікі» актыўна ўдзельнічалі ў акцыях, арганізатарам якіх з'яўляецца Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Напрыклад, у традыцыйнай акцыі, накіраванай на захаванне першацветаў. Нашы навучэнцы цэлы тыдзень прысвяцілі раннім вясновым раслінам: даследавалі, малявалі, выконвалі розныя заданні.

Далучаюцца і да праектаў, якія праводзіць Мінскі гарадскі камітэт прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. У рамках сямейнай акцыі «Сава чакае дапамогі» дзеці разам з бацькамі ездзілі ў біялагічны заказнік мясцовага значэння «Сакаліны»: прыбіралі тэрыторыю, плялі гнездавыя кошыкі для вушастых соў, а потым развешвалі свае работы ў неабходных месцах. На завяршэнне — пікнік.

Як адзначыў дырэктар цэнтра, сямейныя акцыі і праекты практыкуюцца арганізатарамі «зялёных класаў» даволі часта. Напрыклад, узімку дзеці і іх бацькі трапілі на экскурсію па экасцежцы «Горад птушак». Кіраўнікі праекта імкнуліся паказаць, што і ў «халодны сезон» у прыродзе ёсць за чым station назіраць.

***— Ці плануецца пашырэнне маштабу праекта?***

— На дадзены момант нашай мэтай з'яўляецца яго сістэматызацыя і рэарганізацыя. Гэта дазволіць вывесці праект на якасна новы ўзровень. Сёлета мы пачалі заключаць дагаворы аб супрацоўніцтве. Напрыклад, такі дакумент з гімназіяй № 37 Мінска гарантуе сумесную работу ў найбліжэйшыя тры гады, што дае ўпэўненасць у стабільным супрацоўніцтве і дазваляе скласці праграму на доўгатэрміновую перспектыву. Безумоўна, хочацца пашырыць межы праекта. Цяпер мы, акрамя даўно далучаных да праекта школ, сталі актыўна супрацоўнічаць з іншымі. Так, у гэтым годзе пачалі больш працаваць з Фрунзенскім раёнам. Плануем далучыць да дзейнасці «зялёных класаў» як мага больш школ — мінскіх і іншых гарадоў краіны. Для кожнай установы адукацыі ствараем індывідуальную праграму. Усё залежыць ад ландшафтных і біялагічных асаблівасцяў мясцовасці, дзе знаходзіцца школа, — паведаміў Руслан Шайкін. Вядзецца распрацоўка сезонных экасцежак. Такія маршруты абсталююць інфармацыйнымі шыльдамі з актуальнымі звесткамі аб прыродных зменах у тую або іншую пару года. Указальнікі будуць мяняцца па сезонах, а інфармацыя — абнаўляцца.

Пераасэнсоўваецца і метадычнае забеспячэнне навучальнага працэсу. Так, у зеленакласнікаў ёсць і свае палявыя дзённікі, у якія яны запісваюць назіранні, зробленыя на занятках, малююць птушак і казюрак. На дадзены момант структура дапаможніка грунтоўна перапрацоўваецца: будзе дададзены раздзел пра віды, што жывуць на даследаванай зеленакласнікамі мясцовасці. Так вучні змогуць адзначыць звесткі аб убачаных жывёлах і раслінах, запісаць свае назіранні. Плануецца надрукаваць таксама тэматычныя размалёўкі, паштоўкі, закладкі з правіламі экалагічных паводзінаў, плакаты, дзякуючы якім школьнікі будуць лепш запамінаць прадстаўнікоў нашай флоры і фаўны.

**У 2025 годзе будзе перавыдадзена і кніга аб птушках Мінска. Як адзначае Руслан Шайкін, навучэнцам гэты дапаможнік вельмі падабаецца, яны з цікавасцю разглядаюць малюнкі і чытаюць займальную інфармацыю аб птушках. Выйдзе кніга такога ж фармату і аб арнітафаўне Шры-Ланкі, што дазволіць школьнікам значна пашырыць свае ўяўленні аб відавой разнастайнасці.**

— Запланавана таксама канферэнцыя. Падрыхтоўка праектаў, дадатковыя заняткі з навучэнцамі, сама арганізацыя мерапрыемства — усё гэта, безумоўна, патрабуе шмат сіл, але жаданне пашырыць сваю дзейнасць і ў навуковым напрамку ў нас ёсць, — патлумачыў дырэктар цэнтра. — У праекце ў сярэднім удзельнічае каля 1,5 тыс. мінскіх школьнікаў. Упэўнены, у наступным годзе іх пабольшае, бо для гэтага ёсць усе ўмовы. Нам ёсць куды расці.

**Марыя САМАЛЬ.**

Алена СІДАРЭНКА:

# «Колькасць «зялёных школ» няўхільна павялічваецца»



**Фарміраванне сістэмы экалагічных ведаў — адзін з прыярытэтных кірункаў дзяржаўнай палітыкі нашай краіны. Важная роля ў гэтым належыць адукацыйнаму праекту «Зялёныя школы», які ў больш чым 680 установах адукацыі Беларусі стварыў устойлівую сістэму экалагічнага выхавання і выдатныя ўмовы для актывізацыі ўдзелу дзяцей і моладзі ў пытаннях аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага прыродакарыстання. Пра асноўныя дасягненні і планы на 2025 год расказала загадчык аддзела навукова-даследчай і праектнай дзейнасці Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства Алена СІДАРЭНКА.**

— Адукацыйны праект «Зялёныя школы» — унікальны комплексны праект, накіраваны на фарміраванне каштоўнаснага стаўлення да прыроды, павышэнне ўзроўню экалагічнай асветы і інфармаванасці дзяцей і моладзі. Ён адкрывае вялізныя магчымасці для рэалізацыі экалагічных ініцыятыў, а наш цэнтр экалогіі і краязнаўства як рэспубліканскі рэсурсны цэнтр актыўна садзейнічае ажыццяўленню ідэй і праектаў неабыякавых да экалогіі і прыроды дзяцей. Так, у 2023 годзе ініцыятывы навучэнцаў «Зялёных школ» былі рэалізаваны пры супрацоўніцтве цэнтра з ЮНІСЕФ у Беларусі. Напрыклад, у Барысаве хлопцы дзякуючы ўстаноўцы аэратараў змаглі паменшыць водаспажыванне ў некаторых школах горада. А навучэнец з Магілёва стварыў фільтр для ачысткі паветра.

Нездарма колькасць «зялёных школ» няўхільна павялічваецца. Толькі за студзень — чэрвень 2024 года да праекта далучылася каля 20 новых удзельнікаў.

Апошнім часам умацавалася супрацоўніцтва «зялёных школ» і тэрытарыяльных органаў прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя: спецыялісты выступаюць у ролі экспертаў, дапамагаюць данесці актуальную інфармацыю, удзельнічаюць у арганізацыі і правядзенні сумесных інфармацыйных і практычных мерапрыемстваў.

***— Нядаўна падведзены вынікі пілотнага адукацыйнага праекта «ЭКАДАР», накіраванага ў тым ліку на стымуляванне ўдзелу дзяцей у экалагічнай дзейнасці і пашырэнне сеткі «зялёных школ».***

— Асноўная ідэя «ЭКАДАРа» — рэалізацыя сістэмы мерапрыемстваў, накіраваных на экалагічнае выхаванне навучэнцаў, фарміраванне экалагічнай культуры і развіццё патрыятычных якасцяў: любові да Радзімы, беражлівага стаўлення да прыродных багаццяў і роднай зямлі. Дзякуючы такому падыходу ўстановы адукацыі Мінска сталі больш актыўна далучацца да праекта «Зялёныя школы». Характэрна, што некаторыя ўстановы адукацыі сталіцы, якія толькі пачалі работу ў гэтым кірунку, сёлета змаглі атрымаць статус I ступені.

**Адукацыйны праект «Экадар» створаны па ініцыятыве камітэта па адукацыі Мінскага гарвыканкама ў супрацоўніцтве з Мінскім гарадскім камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Непасрэдным арганізатарам яго мерапрыемстваў з'яўляецца Мінскі дзяржаўны турысцка-экалагічны цэнтр дзяцей і моладзі, а ўдзельнікамі — 20 сталічных устаноў агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.**



Фота Марыі САМАЛЬ.



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

***— Падзяліцеся планамі па развіцці праекта «Зялёныя школы» на 2025 год. Ці вядома ўжо, якія мерапрыемствы будуць падрыхтаваны да XVIII Рэспубліканскага экалагічнага форуму?***

— У 2024/2025 навучальным годзе пройдзе шэраг мерапрыемстваў як для педагогаў, так і для навучэнцаў: запланаваны кансультацыі, семінары, адукацыйныя праграмы, конкурсы, метадычныя майстэрні і інш. Таксама сёлета запланавана выданне некалькіх зборнікаў метадычных распрацовак для педагогаў, у тым ліку па пытаннях змены клімату. Да чарговага рэспубліканскага экалагічнага форуму традыцыйна рыхтуюцца інтэрактыўныя адукацыйныя пляцоўкі па ўсіх кірунках дзейнасці праекта. У займальным вучэбна-гульнявым фармаце будзе прадстаўлены самы цікавы досвед работы «зялёных школ» Беларусі. Напрыклад, традыцыйна будзе прэзентавана адукацыйная пляцоўка папулярызацыі даследчай дзейнасці. Кожны ўдзельнік форуму зможа адчуць сябе навукоўцам, назіраючы за цікавымі для яго аб'ектамі пад мікраскопам, у займальнай форме навучыцца правільна сартаваць адходы і даведаецца аб магчымасцях іх далейшай перапрацоўкі.

**Кацярына АРЦЮХОЎСКАЯ.**

# «Я ў экалагі пайду, хай мяне навучаць»

## Пад эгідай Мінпрыроды пачалі працаваць профільныя класы

**Чым бліжэй заканчэнне школы, тым больш пытанняў: кім быць і куды паступаць? Адны з дзяцінства мараць аб канкрэтнай прафесіі, другія да апошняга не могуць зрабіць выбар. Менавіта з гэтай нагоды ва ўстановах адукацыі дзейнічаюць профільныя класы, накіраваныя на паглыбленае вывучэнне пэўных дысцыплін: хіміі, біялогіі, матэматыкі і іншых. Сёлета да іх далучыўся пілотны сумесны праект Мінпрыроды і Мінадукацыі — профільныя класы інжынернага кірунку. Ці лёгка ў іх атрымліваць веды і як праходзяць заняткі, мы даведаліся ў навучэнцаў X класа сярэдняй школы № 161 г. Мінска.**



Галоўная мэта профільных класаў — сфарміраваць цікавасць моладзі да прафесій, звязаных з экалогіяй і рацыянальным (устойлівым) прыродакарыстаннем. У арганізацыі адукацыйнага працэсу ўдзельнічаюць ВНУ, якія падпісалі летам 2024 года дарожныя карты па развіцці супрацоўніцтва з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя ў галіне аховы навакольнага асяроддзя і рацыянальнага (устойлівага) выкарыстання прыродных рэсурсаў на 2024—2026 гады, а таксама спецыялісты ведамстваў, падпарадкаваных Мінпрыроды.

— Урокі праходзяць у традыцыйнай форме, але дзякуючы таму, што ў нас ёсць падзел на профілі па прадметах «Хімія — біялогія» і «Фізіка — матэматыка», большую частку часу мы ўдзяляем заняткам выбранай накіраванасці. Наведваем розныя экскурсіі, якія становяцца своеасаблівымі практычнымі заняткамі. Напрыклад, у Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце вывучалі ўтрыманне нітратаў у розных прадуктах, вызначалі колькасць фосфару ў вадзе і глебе, вымяралі іх кіслотнасць. Нават параўноўвалі ўзровень утрымання розных хімічных элементаў у прадуктах з крамы і сваёй гаспадаркі. А яшчэ нам прадэманстравалі рознае абсталяванне, якім карыстаюцца студэнты; расказалі, якія экзамены трэба здаць, каб паступіць на тую ці іншую спецыяльнасць, — падзялілася **Сафія ГОРКАЯ**.

— Былі мы і ў Геалагічным музеі пры Навукова-вытворчым цэнтры па геалогіі. Там нас пазнаёмілі з экспазіцыяй розных соляў і мінералаў, растлумачылі, дзе, як і для чаго здабываюць тыя ці іншыя камяні. Таксама нас вазілі на метэастанцыю Мінск, дзе мы даведаліся пра ўладкаванне метэапляцоўкі, абсталяванне для вымярэння розных параметраў надвор'я. Аказваецца, тэхніка будзе працаваць, нават калі знікне электрычнасць! А яшчэ мы запусцілі метэазонд! — расказаў **Арцём ЛАТЫШОЎ**.

Хлопца больш прыцягвае хімія. Ён ужо дакладна вырашыў, што хоча паступаць на спецыяльнасць «Фундаментальная хімія» ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. А вось Сафія плануе звязаць сваю будучыню з біялогіяй.

— Хачу, каб мая праца была не толькі карыснай, але і займальнай. Дзякуючы біялогіі я адкрываю для сябе незвычайныя таямніцы прыроды, — растлумачыла дзяўчына. — Вядома, наперадзе яшчэ 11 клас, шмат можа памяняцца, але якраз профільнае навучанне і экскурсіі дапамагаюць атрымаць падрабязнае ўяўленне аб розных прафесіях і зрабіць канчатковы выбар.

— Асаблівую ўвагу ўдзяляем фарміраванню ў вучняў экалагічнай культуры. У нашай школы ёсць дакладная праграма развіцця. Адзін з прыярытэтных кірункаў — эколага-краязнаўчае выхаванне і прыродаахоўная дзейнасць. Вядома, такога прадмета, як экалогія, у нас няма, але пытанні экалагічнай адукацыі разглядаюцца яшчэ з пачатковай школы. Вучні знаёмяцца з прыродай у рамках дысцыплін «Чалавек і свет», «Біялогія», «Хімія», «Геаграфія».

Шмат часу адводзіцца і на пазакласную работу. Дзеці ўцягнуты ў пошукава-даследчую дзейнасць, удзельнічаюць у экалагічных праектах, спаборнічаюць у розных конкурсах як гарадскога, так і рэспубліканскага ўзроўню, наведваюць пазнавальныя семінары. Нядаўна ездзілі ў Музей прыроды ў Тураве, дзе даведаліся пра асаблівасці лесу, яго ролю ў прыродзе і жыцці чалавека. Пабывалі і ў Белавежскай пушчы, дзе на свае вочы ўбачылі, як ахоўваецца жывёльны і раслінны свет, — адзначыла **настаўніца геаграфіі Анастасія ФЕДАРОВІЧ**. — Інжынерныя класы дапамагаюць навучэнцам больш часу ўдзяляць сферы, якая іх цікавіць, дазваляюць удзельнічаць у экалагічных праектах, матывуюць звязаць сваю будучыню з аховай навакольнага асяроддзя.

**Марыя САМАЛЬ.**
**Фота з архіва сярэдняй школы № 161 г. Мінска.**

# БЫЛА ЭПОХА...

## Прыгадаем вехі беларускага кіно ў дзень яго стагоддзя

**Да 100-годдзя беларускага кіно былі зняты тры адметныя стужкі, якія звяртаюць да гісторыі: «Дэманстратар», «Трэст, які не лопнуў», «Залатая эпоха Беларусьфільма». Іх прэм'ера стала фактычна агульнанацыянальнай і шмат у чым нясе адкрыццё: не трэба штучна шукаць падставу для гонару за айчыннае кіно, трэба згадаць яго адметнасці.**

### Больш за 100?

Цягнік сінематографа спыніўся ў Мінску яшчэ ў 1900 годзе. Магчыма, ён даставіў сюды аднаго з уладальнікаў першых кінатэатраў — Рыхарда Штрэмера, які хутка наладзіў бізнес праз дэманстрацыю стужак. Ды аднойчы зразумеў, што можна ж не толькі паказваць чужыя, але і здымаць свае, фактычна ён стаў прадзюсарам у кіно ў той час, калі пра такую спецыяльнасць ніхто не здагадваўся. Пра Штрэмера распавядае фільм «Дэманстратар». Карціна вытанчаная і густоўная, таму што бярэ за аснову старую хроніку і дакументальныя факты, але раскрывае іх сутнасць без адзінага прамоўленага слова, у чорна-белых тонах і пад музыку тапёра: усё, як у нямым кіно!

### КІНАФАБРЫКА

Афіцыйны адлік айчыннай кінагісторыі вядзецца з адкрыцця ў снежні 1924 года адміністрацыйнага органа — «Белдзяржкіно», які называўся «трэст». Дакументальны фільм «Трэст, які не лопнуў» рэжысёр Юрый Цімафееў прысвяціў этапу станаўлення айчыннай кінаіндустрыі.

У першыя гады кіно Беларусі стваралася па складанай схеме. Шмат якія пытанні вырашаліся ў Мінску. Але з 1928 да 1939 года кінафабрыка «Савецкая Беларусь» знаходзілася па-за тэрыторыі рэспублікі, у Ленінградзе. Кінафабрыку ў Мінску пачалі будаваць у раёне цяперашняга «МотаВелаЗавода» ў 1930-я гады. Да сакавіка 1939-га з Ленінграда перавезлі абсталяванне.

### «Крылы» для Таркоўскага

«Лясная быль» — знакавы, сімвалічны і вельмі невыпадковы для беларускага кіно фільм. Не толькі таму, што першы (1926 г.). Ён цалкам здымаўся ў Беларусі, у пасёлку Прылукі, што пад Мінскам. Цудоўная натура, беларуская прырода і, вядома, аповесць Міхася Чарота. Рэжысёр Юрый Тарыч быў ужо дасведчаны, калі ўзяўся за здымкі: яго фільм «Крылы халопа» ў Расіі меў вялізны поспех. Нездарма пазней Андрэй Таркоўскі амаль працытаваў кадры з гэтага фільма ў сваёй карціне «Андрэй Рублёў».

### Крывавыя раны

Падчас вайны кінамайстроў з Мінска эвакуіравалі ў Алма-Ату. А ў 1946 годзе студыя «Савецкая Беларусь» перайменавана ў «Беларусьфільм», кінематаграфісты пераязджаюць у будынак Чырвонага касцёла ў Мінску. Жыццё наладжвалася, але раны былі яшчэ свежыя. Адна з першых пасляваенных карцін, прысвечаных тэме вайны, — «Канстанцін Заслонаў». Рэальныя героі, рэальныя сітуацыі — вось што бяруць за аснову майстры. Як і ў стужцы «Гадзіннік спыніўся апоўначы» — пра тое, як гаўляйтара Вільгельма Кубэ беларусы пакаралі смерцю. Адна з улюбёных карцін таго часу — «Дзяўчынка шукае бацьку» Льва Голуба пра тое, як ратавалі маленькую дачушку партызана бацькі Панаса.

### Прафесіяналы

Часы 1960—1980-х гадоў называюць «Залатой эпохай Беларусьфільма» — так і называецца асобны дакументальны фільм Яўгена Сяцько.

Вайна, што была за плячыма кінематаграфістаў, якія прыйшлі ў той час, паўплывала на інтанацыю. Напрыклад, фільм «Праз могілкі» — дыпломная праца Віктара Турава — нетрадыцыйная кінакарціна пра вайну: без батальных сцэн, з акцэнтам на няпростыя характары герояў. Нездарма да 100-годдзя сусветнага кіно фільм быў уключаны ў спіс ЮНЕСКА «100 найлепшых фільмаў пра Другую сусветную вайну». Далей у яго будзе «Я родам з дзяцінства», а Ігар Дабралюбаў выпусціць стужку «Іван Макаравіч», герой якой — хлопчык, які з-за ваеннага ліхалецця вымушаны пасталець раней, чым трэба, так што нават дарослыя звяртаюцца да яго з іменем па бацьку. Фільм атрымаў Гран-пры — «Сярэбраная Мінерва» на XXII кінафестывалі дзіцячых фільмаў у Венецыі. Кранальна пачалавечы прагучала «Альпійская балада» Барыса Сцяпанава, дзе раскрываецца любоўная лінія: жыццё брала сваё.

Валерыя Рубінчыка параўноўвалі з Федэрыка Феліні — сярод калег рэжысёр атрымаў мянушку Фелінчык. Усе яго фільмы атмасферныя, варта хоць бы згадаць «Дзікае паляванне караля Стаха», «Вянок санетаў»...

Аповед пра Беларусь «Людзі на балоце» Віктара Турава ў свой час крануў сэрцы гледачоў усяго Саюза, як вынік — Дзяржпрэмія СССР і галоўны прыз на ўсесаюзным кінафестывалі 1982 года.

І яшчэ адно знакавае імя — Міхаіл Пташук. Ён умеў здымаць драматычныя карціны, раскрываючы акцёрскія таленты, згадаем «Знак бяды» з Нінай Русланавай і Генадзем Гарбукам.



За фільм «Белыя росы» Ігар Дабралюбаў атрымаў шырокую любоў гледача — фільм стаў самым касавым у год выхаду, а, па версіі часопіса «Савецкі экран», яго прызналі найлепшай камедыяй года. Ды і цяпер паказваюць часта — трапіш на знаёмыя кадры, дык зацягваюць. Жывое, пра жыццё, жыццесцвярджальнае кіно. Хочацца, каб так і было...

*Больш падрабязна пра гісторыю беларускага кіно чытайце на сайце zviazda.by*

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Вилейский райагросервис»

| Лот | Наименование | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1363 | Емкость для воды б/у, инв. № 1391-О1 | 550,80 | 55,08 | 27,54 |
| 1365 | Весы РП-1Ш-13С, инв. № 302Т | 129,60 | 12,96 | 6,48 |
| 1366 | Весы для скота, инв. № 309Т | 410,40 | 41,04 | 20,52 |
| 1368 | Бочка МЖТ б/у, инв. № 6027 | 691,20 | 69,12 | 34,56 |
| 1369 | Бочка, инв. № 6101Т | 691,20 | 69,12 | 34,56 |
| 1373 | Стол переговоров | 324,00 | 32,40 | 16,20 |
| 1374 | Охладитель молока б/у, инв. № 6062 | 518,40 | 51,84 | 25,92 |
| 1375 | Кабина б/у без док., инв. № 6063 | 1 047,60 | 104,76 | 52,38 |
| 1376 | Кабина б/у без док., инв. № 6064 | 1 047,60 | 104,76 | 52,38 |
| 1377 | Отопительный котел, инв. № 741; сейф, инв. № 116-О; ворохосушилка Журихи, инв. № 103Т; сейф; весы; тележка; бетоносмеситель б/у; котел отопительный | 930,96 | 93,10 | 46,55 |
| 1378 | Компьютер ELATRON L 1734; компьютер ACT, инв. № 1010; компьютер PHILIPS, инв. № 1044A; компьютер, инв. № 301-О; факс PANASONIC-KX-FT 98, инв. № 3056; компьютер ELATRON L 1734, инв. № 3069; компьютер 215, инв. № 5005; компьютер TOWER, инв. № 5007A; компьютер TOWER, инв. № 5008; локальные сети с компьютером, инв. № 114; многофункциональное устройство | 902,88 | 90,29 | 45,14 |
| 1379 | Стекло, 20 кв. м; шкив; ремень, 4 шт.; цепь зерновая, 4 шт.; пружина растяжная, 30 шт.; редуктор нижний – вальц; редуктор целендрич. | 1 846,80 | 184,68 | 92,34 |
| 1380 | Автомобиль LADA52-88AK, инв. № 19170 (без док.) | 1 944,00 | 194,40 | 97,20 |
| 1381 | Емкость для зерна | 2 484,00 | 248,40 | 124,20 |
| 1383 | Секция с дубовым фасадом, инв. № 27; секция, инв. № 268-О; письменный стол; вешалка; стеллаж офисный; стол письменный; стол угловой; стул на раме, блок 2 стула, 5 шт.; стул на раме, блок 3 стула, 7 шт.; тумба офисная; тумба под орг. техн.; шкаф-купе | 2 217,24 | 221,72 | 110,86 |
| 1384 | Охладитель молока МК-2000, инв. № 1735; рекупиратор воды, инв. № 305-О | 5 551,20 | 555,12 | 277,56 |
| 1385 | Сеялка СТВ, инв. № 282-О | 7 128,00 | 712,80 | 356,40 |
| 1386 | Пресс-подборщик ПРМ-150 Лиз. Минск, инв. № 3115 | 9 612,00 | 961,20 | 480,60 |
| 1387 | Пресс-подборщик ПРМ-150 Лиз. Минск, инв. № 3116 | 9 612,00 | 961,20 | 480,60 |
| 1388 | Почвообрабатывающий агрегат АПП 6Д б/у, инв. № 6034 | 41 904,00 | 4 190,40 | 2 095,20 |
| 1389 | КОК - 6-2 для уборки кукурузы, инв. № 3124 | 30 564,00 | 3 056,40 | 1 528,20 |
| 1390 | КЗС Журихи (Силосы), инв. № 6061-ОС, 8 шт.; КЗС Журихи (Карскас), инв. № 6061-ОС | 20 487,60 | 2 048,76 | 1 024,38 |

| Лот | Наименование | Местонахождение и земельный участок | Начальная цена с учетом НДС 20 %, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1793 | Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-65207 (назначение – здание специализированное для ремонта и (или) технического обслуживания автомобилей (в том числе автомобильные заправочные, зарядные и газонаполнительные станции), наименование – станция технического обслуживания автомобилей, общая площадь – 4691,9 кв. м, составные части и принадлежности: одноэтажная кирпичная станция технического обслуживания автомобилей с трехэтажным кирпичным административно-бытовым корпусом и навесом | Кадастровый номер 213854121010001 83, площадью 0,7037 га, назначение – для размещения объектов по ремонту и обслуживанию. Право аренды. Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, аг. Шиловичи, ул. Советская, 9 | 18816,00 | 1881,60 | 940,80 |
| 1794 | Капитальное строение с инвентарным номером 631/С-62018 (назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание бани, общая площадь – 242,3 кв. м, составные части и принадлежности: здание бани с пристройкой, сараем) | Кадастровый номер 213854121010000 09, площадью 11,6867 га, назначение – для содержания и обслуживания зданий и сооружений. Право постоянного пользования. Минская обл., Вилейский р-н, Осиповичский с/с, аг. Шиловичи, ул. Советская, 9 | 3072,00 | 307,20 | 153,60 |

В отношении лотов №№ 1363, 1365, 1366, 1368, 1369, 1373–1381, 1383–1390 проводятся первые повторные торги. **Стоимость снижена на 10 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 220 (30354) от 12.11.2024, стр. 15. В отношении лотов №№ 1793, 1794 проводятся шестые повторные торги. **Стоимость снижена на 60 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 160 (30294) от 17.08.2024, стр. 14

**Местонахождение лотов №№ 1363, 1365, 1366, 1368, 1369, 1373–1381, 1383–1390:** Минская область, Вилейский р-н, д. Осиповичи

В отношении лотов №№ 1793, 1794 имеется ограничение (обременение) в виде залога (залогодержатель – ОАО «Белагропромбанк»). Залог прекращается в случае реализации объекта на торгах (ст. 15 Закона Республики Беларусь от 20.06.2008 г. № 345-З (ред. от 28.06.2022 г.) «Об ипотеке»)

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **27 декабря 2024 года в 14.00 (регистрация с 13.30 до 13.55)** |
| **Срок приема заявлений и внесения суммы задатка** | с 10.00 17 декабря 2024 года до 15.00 26 декабря 2024 года |

**Условия для участия в торгах:** 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ОАО «Вилейский райагросервис», проводимых 27.12.2024.

2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31–33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр. лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр. лица, копия Устава – для юр. лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375293082897, +375293058650.

3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.

4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.

**Вознаграждение аукциониста: по лотам №№ 1363, 1365, 1366, 1368, 1369, 1373, 1374, 1377, 1378 – 10 %, по лотам №№ 1375, 1376, 1379–1381, 1383, 1794 – 9 %, по лотам №№ 1384–1387 – 8 %, по лотам №№ 1388–1390, 1793 – 7 % от конечной цены предмета торгов.**

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 20 (двадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.

6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться на странице лота на сайте https://orgtorg.by/.

7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться по телефону **+375299999112, Чеслав. Дополнительная информация по лотам №№ 1793, 1794 по тел. +375293082762, Екатерина.**

8. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

9. Государственная регистрация (удостоверение) договора купли-продажи недвижимого имущества и возникающих на его основании прав осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет.

| | |
|---|---|
| **Информация о продавце** | **ОАО «Вилейский райагросервис» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375172552928 (222416, г. Вилейка, ул. 1 Мая, 105, УНП 600010756)** |
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg** |

# ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона по продаже пустующего жилого дома

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона и место его нахождения** | Одноквартирный жилой дом, расположенный по адресу: Минская обл., Березинский район, Поплавский с/с, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, 52 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **17 января 2025 года в 10.00, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, 2** |
| **Продавец, его адрес и телефоны** | Поплавский сельский исполнительный комитет Березинского района Минской области. Минская обл., Березинский район, аг. Поплавы, ул. Октябрьская, 2, Поплавский сельисполком, конт. тел.: (801715) 63818, 63821. Эл. адрес **poplavss@berezino.gov.by** |
| **Характеристика пустующего жилого дома** | Одноэтажный жилой дом, деревянный, общая площадь – 49 кв. м, печное отопление, крыша – шифер. Зарегистрирован |
| **Земельный участок** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, не зарегистрирован |
| **Начальная цена** | 1 базовая величина (40 бел. руб.) |
| **Сумма задатка** | 20 % от начальной цены (8,00 руб). Задаток перечисляется на расчетный счет BY72AKBB36410602001776200000, БИК AKBBBY2X в ОАО «АСБ Беларусбанк», УНП 600036561, код платежа 04805. Получатель – Поплавский сельский исполнительный комитет |
| **Подлежащие возмещению расходы, связанные с проведением аукциона** | Объявление в газету |
| **Начало и окончание приема документов** | С даты объявления аукциона **до 16 января 2025 года (включительно)** с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 |

Аукцион проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 24 марта 2021 г. № 116 «Об отчуждении жилых домов в сельской местности и совершенствовании работы с пустующими домами» и Положением о порядке продажи без проведения аукционов пустующих жилых домов, организации и проведения аукционов по их продаже, утвержденному Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.09.2021 № 547.

Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также юридические лица, если иное не установлено законодательными актами и международными договорами Республики Беларусь.

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. подать заявление об участии в аукционе по установленной форме;
2. предоставить квитанцию об оплате суммы задатка;
3. предоставить паспорт и копию его страниц, содержащих идентификационные сведения, либо нотариально удостоверенную доверенность;
4. заключить соглашение с местным исполнительным комитетом о правах, обязанностях и ответственности сторон.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с пустующим жилым домом на местности.

**Условия:** Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на предоставление ему пустующего дома в частную собственность с внесением платы за пустующий дом в размере начальной цены предмета аукциона, увеличенной на 5 %, обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона или признания аукциона несостоявшимся:

внести плату за предмет аукциона и возместить затраты на организацию и проведение аукциона;

подать заявление о предоставлении земельного участка;

после принятия соответствующего решения – обратиться в Березинское бюро Борисовского филиала РУП «Минское областное агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» за государственной регистрацией земельного участка и жилого дома.

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
## на право заключения договоров аренды нежилых помещений

Организатор аукциона –

## РУП «Белтелеком», в лице Брестского филиала,

*расположенного по адресу: г. Брест, пр-т Машерова, 21-2.*

На аукцион выставляется право заключения договоров аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

**Лот 1:** Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении, встроенно-пристроенном помещении АТС, общей площадью 15,5 кв. м по ул. Стафеева, д. 21, в г. Бресте Брестской области:

1.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 15,5 = **3,875 БАВ.**

**Лот 2:** Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении, встроенно-пристроенном помещении АТС, общей площадью 7,9 кв. м по ул. Стафеева, д. 21, в г. Бресте Брестской области:

2.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 7,9 = **1,975 БАВ.**

**Лот 3:** Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении, встроенно-пристроенном помещении АТС, общей площадью 11,2 кв. м по ул. Стафеева, д. 21, в г. Бресте Брестской области:

3.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 11,2 = **2,8 БАВ.**

**Лот 4:** Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении, встроенно-пристроенном помещении АТС, общей площадью 3,2 кв. м по ул. Стафеева, д. 21, в г. Бресте Брестской области:

4.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 3,2 = **0,8 БАВ.**

**Лот 5:** Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении, встроенно-пристроенном помещении АТС, общей площадью 10,5 кв. м по ул. Стафеева, д. 21, в г. Бресте Брестской области:

5.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 10,5 = **2,625 БАВ.**

**Лот 6:** Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении, встроенно-пристроенном помещении АТС, общей площадью 38,8 кв. м по ул. Стафеева, д. 21, в г. Бресте Брестской области:

6.1 Начальная цена продажи права заключения договора аренды и размер задатка составляют:

1БАВ * 0,25 * 38,8 = **9,7 БАВ.**

**Лот 7:** Помещение на 1-м этаже в изолированном помещении, встроенно-пристроенном помещении АТС, общей площадью 12,5 кв. м по ул. Стафеева, д. 21, в г. Бресте Брестской области:

